Падписка на „ЗЬЯЗДА"
(з дармовым дадаткам „Прафух")

На 1 мес.	— 90 к.
„ 3 мес.	2 р. 60 к.
„ 6 мес.	5 р. —
„ 12 мес.	9 р. 75 к.

Падпіска і абвесткі прымаюцца ў гал. канторы газ. „Зьвязда" Менск, Савецкая, 63, 3-ці паверх, тэл. 7-81.

ПЛАТА ЗА АБВЕСТКІ
За радок комп. пасьля тэксту—50 к., іншагародняя абвесткі—1 р. за радок. Пасярод тэксту—у два разы дарожэй. Пры шматразовым друкаваньні—скідка. Звыш тарыфу, згодна пастановы СНК ад 10-IX—24 г. бярэцца 10 проц. надбавкі.

Эпл. Москва, Библиотека ВОКС СССР
Ст. Съ /Зв. I/

ПРАЛЕТАРЫ ЗЛУЧАЙТЕСЬ ВСЕ СТРАНЫ

ЗЬЯЗДА

Орган Цэнтральнага Камітэту Камуністычнае партыі (бальшавікоў) Беларусі і Менскага АК КП(б)Б

Рэдакцыя
Старшыня
Сакратар
Партсэктар
Сэктар інфармацыі
Начны рэдактар
Галоўная кантора
Аддзел падпіскі
„ абвестак

1930 г.
№ 125 (323)
Год выданьня—XIV.
РЭДАКЦЫЯ і ГАЛОЎНАЯ КАНТОРА
МЕНСК, Савецкая, 63.

КП(б)Б была і застаецца непахіснай апорай Ленінскага ЦК УсеКП(б)

Бальшавікі Беларусі горача вітаюць правадыра партыі, пасьлядоўнага праваднікa ідэй Леніна—т. І. Сталіна

ЗА ЛЕНІНСКІ ЦК УсеКП(б)

Уся УсеКП(б) рыхтуецца да XVI зьезду. Мэты і задачы нашай партыі глыбока інтэрнацыянальны і ўся работа нашай партыі, пад кіраўніцтвам яе ЦК,—вырозны довад пралетарскага інтэрнацыяналізму. За мінулы час яшчэ больш вырасьлі роля і значэньне УсеКП(б) у сусьветным камуністычным руху, у Камуністычным Інтэрнацыянале. Пры кіраўнічым удзеле нашай партыі, на чале з яе ЦК, Камуністычны Інтэрнацыянал даваў свячасова бязьпітасны адпор усім апартуністычным тэорыям у розных сэкцыях Камінтэрну. Пры кіраўнічым-жа ўдзеле нашай партыі была выпрацавана праграма Камуністычнага Інтэрнацыяналу—праграма міжнароднай пралетарскай рэвалюцыі. У галіне міжнароднай палітыкі Савецкага Саюзу наша партыя праводзіла і праводзіць пасьлядоўна палітыку міра. Ва ўмовах непасрэдна навісшай пагрозы вайны партыя з яшчэ большай энэргіяй узмацняе абароназдольнасьць краю для таго, каб быць падрыхтаванымі да адпору міжнароднаму імпэрыялізму.

ЦК УсеКП(б) праводзіў непрымірыма бальшавіцкую палітыку ў галіне індустрыялізацыі краю. І ў рэзультаце гэтай правільнай палітыкі мы маем вялізарнейшыя дасягненьні ў галіне індустрыялізацыі краю. Лёзунг партыі—дагнаць і перагнаць перадавыя капіталістычныя краіны ажыцьцяўляецца на справе. Днепрабуд, Турксіб, Трактарабуд, Аўтабуд і г. д., і г. д. Дзе і які край ў гісторыі чапавецтва ведаў такія тэмпы разгортваньня прамысловасьці! Мы дасягнулі такіх тэмпаў толькі таму, што наша партыя, пад кіраўніцтвам ЦК, зможа арганізаваць правільнае выкарыстаньне ўсіх магчымасьцяй, запожаных у сыстэме дыктатуры пралетарыяту. Мы павінны падкрэсьліць, што толькі маючы такі баявы штаб, як наш сталёвы ЦК УсеКП(б), мы змаглі так арганізаваць працоўныя масы, натхніць іх той творчай энэргіяй, якая ёсьць у рабочай клясе і сярод бядняцка-сераднякіх мас вёскі для справы пабудовы сацыялізму.

Пад кіраўніцтвам ЦК УсеКП(б) была распрацавана пяцігодка і пад яго кіраўніцтвам мы дабіліся ня толькі выкананьня гаспадарчых плянаў, але і перавыкананьня іх. Пад кіраўніцтвам ЦК мы пяцігодку выканаем за чатыры гады. Прамысловасьць, у першую чаргу, тая частка, якая выпрацоўвае сродкі вытворчасьці, узмацніла сваю вядучую ролю на ўсей народнай гаспадарцы. Развіцьцё нашай прамысловасьці аказвае глыбокі рэвалюцыянізуючы ўплыў на развіцьцё сельскае гаспадаркі.

Толькі ў выніку рашучага правядзеньня лініі партыі на ўзмацненьне вядучай ролі прамысловасьці, толькі ў выніку цалкам апраўдаўшай сябе лініі ЦК па насьпіраваньні саўгасаў і ўпартай барацьбы за арганізацыю і ўзмацаньне калгасаў, толькі на аснове жорсткай барацьбы супроць капіталістычных элемэнтаў, толькі ў выніку працяглай барацьбы за ўзмацненьне саюзу рабочае клясы і беднаты з сераднякам, узмацненьне кіруючай ролі рабочае клясы ў гэтым саюзе, толькі на аснове разгортваньня вытворчых форм змычкі партыя змагла забясьпечыць нарэшце пераход вёскі да сацыялізму. Толькі ў выніку жорсткай барацьбы супроць правага апартунізму і левых загібаў мы дабіліся гэтых посьпехаў. Толькі кіруючыся наскрозь ленінскім разуменьнем сутнасьці саюзу рабочае клясы і беднаты з сераднякам, мы маглі выкпікаць м... калгасны рух. Як правільна гаварыць тэсісы тав. Якаўлева да XVI партзьезду, калі канфіскацыя зямлі ў памешчыкаў была першым крокам пралетарскай рэвалюцыі ў вёсцы, дык паварот серадняка да калгасу і масавая калектывізацыя зьяўляецца другім буйнейшым крокам нашай пралетарскай рэвалюцыі. І гэты другі буйнейшы крок рэвалюцыі быў намі праробленны пад ленінскім кіраўніцтвам ЦК УсеКП(б).

За час пасьля XV зьезду ў краі адбыліся вялізарнейшыя зрухі клясавых сіл. У рэзультаце правільнай палітыкі ЦК мы маем вялізарнае колькаснае па вялічэньне рабочае клясы, вялізарны ўздым сярод шырокіх рабочых мас, ахоп сацспаборніцтвам і ўдарніцтвам мільённых мас рабочае клясы, масавае ўступленьне рабочых у партыю.

Пад кіраўніцтвам нашага ЦК партыя прарабіла багатую станоўчымі рэзультатамі работу па выцісканьні і абмежаваньні капіталістычных элемэнтаў горараду і вёскі. Прыватна-капіталістычны сэктар сыстэматычна выбіваўся са сваіх пазыцый. У выніку «вялікага пераломy», у выніку рашаючых посьпехаў у галіне замены кулацкай вытворчасьці буйнаю вытворчасьцю саўгасаў і калгасаў і г. д., партыя, пад кіраўніцтвам яе Цэнтральнага Камітэту, перайшла ад палітыкі абмежаваньня і выцісканьня кулацтва да палітыкі ліквідацыі кулацтва, як клясы, на аснове суцэльнай калектывізацыі. Уся партыя, пад кіраўніцтвам ЦК УсеКП(б), пры актыўным удзеле бядняцка-серадняцкіх мас, прарабляе вялізарную работу па раскулачваньні, па экспрапрыяцыі сродкаў вытворчасьці кулацтва ў раёнах суцэльнай калектывізацыі.

У сваім артыкуле «Год вялікага пераломy» тав. Сталін адзначаў, што партыя дабілася павароту сялян да сацыялізму, мабілізацыі мас для пасьпяховага выкананьня пяцігодкі, для барацьбы з бюракратызмам, але што становішча з кадрамі застаецца вострым і што пераломy ў галіне падрыхтоўкі кадраў яшчэ няма. Цяпер мы маем магчымасьць канстатаваць, што ў выніку ўжытых ЦК УсеКП(б) мер, асабліва пасьля пістападаўскага пленуму ЦК, ствараецца пералом і ў галіне падрыхтоўкі кадраў, што зьяўляецца адным з найбольшых нашых дасягненьняў за апошнія паўгода. Побач з гэтым, пад кіраўніцтвам Цэнтральнага Камітэту на шай партыі, была праведзена вялізарнейшая работа па перабудове працы ўсіх вагароў дыктатуры пралетарыяту.

Станоўчыя вынікі мы маем і ў галіне разгортваньня самакрытыкі. Адозва ЦК УсеКП(б), вядомыя паказаньні тав. Сталіна, рашучая барацьба з канкрэтнымі праяўленьнямі зацiску самакрытыкі—усё гэта забясьпечыла разгортваньне сапраўды пралетарскай бальшавіцкай дзелавой самакрытыкі.

Усіх гэтых дасягненьняў у галіне міжнародай і ўнутраной палітыкі мы змаглі дабіцца таму, што лінія ЦК УсеКП(б) была ленінскай, што работа ЦК была бальшавіцкай. Наша партыя, пад непасрэдным кіраўніцтвам ЦК дабілася гэтых вялізарных посьпехаў толькі ў выніку непрымірымай барацьбы супроць правых і «лева»-апартуністычных элемэнтаў. Мы з посьпехам разграмілі контр-рэвалюцыйны трацкізм Асабліва пасьля XV зьезду пачаў сябе актыўна праяўляць праваапартуністычны ўхіл, які адбіваў супраціўленьне капіталістычных элемэнтаў сацыялістычнаму наступленьню. ЦК УсеКП(б) свячасова сыгналізаваў партыі аб небясьпецы праваапартуністычнага ўхілу. ЦК свячасова мабілізаваў партыю на барацьбу з праваапартуністычным ухілам, з тэорыяй і практыкай правых апартуністых, гэтых кулацкіх агентаў у радох партыі. ЦК свячасова падкрэсьліў, што правая небясьпека зьяўляецца галоўнай небясьпекай на даным этапе сацыялістычнага будаўніцтва. І ўся партыя, пад кіраўніцтвам ЦК, правяла вялізарнейшую работу па выкрыцьці правага апартунізму ў тэорыі і на практыцы, бязьпітасна змагаючыся з канкрэтнымі носьбітамі апартунізму. Партыя разгарнула вялізарную барацьбу супроць правых апартуністых і іх ідэалёгаў (група Бухарына), супроць правых тэорый аб «дэградацыі сельскай гаспадаркі», аб непасільнасьці тэмпаў сацыялістычнага будаўніцтва, аб неабходнасьці раўненьня на «вузкія месцы», аб замаруджаньні тэмпаў саўгаснага і калгаснага будаўніцтва, аб «ваенна-фэўдальнай эксплёатацыі сялянства», супроць тэорыі мірнага ўрастаньня кулака ў сацыялізм і г. д. Пад нацiскам крытыкі партыйных мас і ЦК лідэры правага ўхілу капітулявалі.

Правыя апартуністыя, якія на словах прызнапі памылковасьць сваіх поглядаў, на справе двурушнічаюць. Яны робяць спробы выкарыстаць памылкі і скажэньні, дапушчаныя ў паасобных мясцох для дыскрэдытацыі правільнай партыйнай лініі, для дыскрэдытацыі партыйнага кіраўніцтва.

За гэты-ж час партыя правяла вялікую работу па выкрыцьці сутнасьці «левых» загібаў, асабліва ў калгасным будаўніцтве. Вынікі калектывізацыі і веснавой сяўбы поўнасьцю пацьвярджаюць правільнасьць лініі ЦК у пытаньні калгаснага будаўніцтва.

Таксама поўнасьцю пацьвердзілася правільнасьць і свячасовасьць дырэктыў партыі аб барацьбе з перагібамі ў галіне калгаснага руху.

ЦК свячасова папярэдзіў аб небясьпецы недаацэнкі індывідуальных бядняцка-сераднякіх гаспадарак, якія яшчэ ня ўступілі ў калгас і зьвярнуў увагу партыйных арганізацый на неабходнасьць устанаўленьня правільных узаемаадносін паміж калгаснікамі і індывідуальнікамі, на неабходнасьць забесьпячэньня поўнага правядзеньня пасеўнай кампаніі.

ЦК увесь час змагаўся на два франты, зусім правільна накіроўваючы гаўпоўны агонь на правы ўхіл. У барацьбе на два франты ўзмацнілася наша партыя. Усіх нашых посьпехаў мы дабіліся таму, што з боку ЦК была праяўлена бальшавіцкая непрымірымасьць да ўсялякіх адхіленьняў ад ленінізму, ад генэральнай лініі партыі, да правай небясьпекі, як галоўнай, да «левых» загібаў і рэшткаў трацкізму.

Так, Сталін зьяўляецца лепшым вучнем Леніна. Сваёй бальшавіцкай непрымірымасьцю да ўхілаў ад лініі партыі, сваім цьвёрдым і пасьлядоўным правядзеньнем партыйнае лініі тав. Сталін заснужыў нянавісьць з боку ўсіх апартуністых.

Усе апазыцыі ў партыі, усе антыпартыйныя плыні прыкрывалі свае апартуністычныя тэорыі, антыпартыйныя выпазкі супроць ЦК паклёпніцкімі наскокамі на тав. Сталіна. Наш ЦК заўсёды выкрываў апартуністычную, антыпартыйную сутнасьць усіх гэтых наскокаў на тав. Сталіна.

І падагульваючы вынікі работы ЦК УсеКП(б), мы шлем гарачае бальшавіцкае прывітаньне ЦК УсеКП(б) і правадыру нашай партыі тав. Сталіну.

АДКРЫЎСЯ XIII ЗЬЕЗД КП(б)Б

Учора ўвечары ў памяшканьні Дому Культуры адкрыўся XIII зьезд КП(б)Б. Зьезд адкрыў сакратар ЦК КП(б)Б тав. **Гей.**

Уступная прамова т. Гея

Таварышы! Паміж XII і XIII зьездам партыя прайшла багаты зьместам шлях. Посьпехі індустрыялізацыі краю, шпаркае разгортваньне прамысловасьці стварылі базу для развіцьця калгаснага руху. Сацыялістычны сэктар у сельскай гаспадарцы вырас і ўмацаваўся. Гэта абумовіла пераход партыі да палітыкі ліквідацыі кулацтва, як клясы. У будаўніцтве сацыялізму ў нашым краі мы дабіліся вялізарнейшых посьпехаў. Партыя не змагла-б дасягнуць гэтых посьпехаў, калі-б пасьлядоўна і пяўхільна не праводзіла генэральнай лініі. Непрымірымай барацьбой з правым ухілам, які зьяўляецца галоўнай небясьпекай, партыя абавязана тым дасягненьням, якія яна мае. Вядучы барацьбу па два франты, перамагаючы ўсякага роду ўхілы ад асноўнай лініі партыі, партыя разьбіла ўшчэнт рэшткі контр-рэвалюцыйнага трацкізму і дала адпор «левым» загібам, якія стварылі нагрозу паслабленьня змычкі рабочае клясы з асноўнымі масамі сялянства.

Адначасова з барацьбой супроць правага апартунізму наша партыя правяла рашучую барацьбу з пацыянал-апартунізмам—з розпаўнасьцю правага апартунізму ў пацыянальным пытаньні. Партыя дала адпор беларускаму пацыянал-дэмакратызму, а таксама шавінізмам усемагчымага роду, вялікадзяржаўнаму шавінізму, яўрэйскаму, польскаму і інш. Гэта пяўхільная барацьба партыі за правядзеньне генэральнай лініі і посьпехі ў гаспадарчым будаўніцтве мабілізавалі актыўнасьць рабочае клясы, стварылі ў рабочай клясе нябывалы вытворчы ўздым. Рост актыўнасьці рабочае клясы выявіўся і ў разгортваньні самакрытыкі. У гэтай галіне наша арганізацыя мае пэўныя посьпехі, хоць мы павінны прызнаць, што самакрытыка разгорнута ў нас яшчэ далёка невыстарчальна. Работы нашага зьезду мы павінны весьці пад знакам дзелавой бальшавіцкай самакрытыкі. Зьезд павінен паказаць нам асноўныя шляхі, ідучы па якіх мы разгорнем і мабілізуем актыўнасьць рабочае клясы, будзем выхоўваць далей новыя пралетарскія кадры нашай партыйнай арганізацыі, з яшчэ большай пасьлядоўнасьцю, непрымірымасьцю мы будзем надалей праводзіць барацьбу за генэральную лінію партыі.

Правая небясьпека ў сучасны момант узмацняецца. Аб гэтым сьведчаць проіскі апартуністых усіх колераў. Наш зьезд, займаючыся дзелавой творчай работай, разьбіраючы дзелавым парадкам дасягненьні і недахопы мінулага, павінен будзе прайсьці пад знакам рашучага адпору усялякім спробам скажэньня лініі партыі. Зьезд пакажа партыйнай арганізацыі той шлях, па якім мы яшчэ больш упэўненымі крокамі пойдзем да новых дасягненьняў і посьпехаў.

На зьезд прыбылі 342 дэлегаты са станоўчым голасам. Такім чынам зьезд зьяўляецца ўнаўне правамоцным. Па даручэньні Цэнтральнага Камітэту абвяшчаю XIII зьезд КП(б)Б адчыненым. (Бурныя воплескі).

Выбары кіруючых органаў зьезду

Па прапанове дэлегацый Віцебскай, Менскай і Гомельскай зьезд выбраў прэзыдыум у складзе 65 таварышоў, мандатную камісію ў складзе 17 таварышоў, сакратарыят — 20 таварышоў і рэдакцыйную камісію ў складзе 21 таварыша.

Прэзыдыум

Мануільскі, Трылісэр, Гей, Васілевіч, Галадзед, Калнін, Рыжоў, Гантман, Чарвякоў, Сянкевіч, Рапапорт, Грысевіч, Бэнэк, Ігнатоўскі, Самойлаў, Хацкевіч, Арошштам, Ягораў, Рачыцкі, Славінскі, Чычэраў, Хлеўнікаў, Судакоў, Астапенка, Кавальчук, Фёдараў, Чарнушэвіч, Рыскін, Іваноў, Палякоў, Дамброўскі, Мундау, Зелянкоўскі, Пятушкоў, Шпэктараў, Венда, Разумаў, Аверын, Аксючыц, Амбражэвічус, Валодзька, Ляўкоў, Малашонак, Нахільніцкі, Рэзьнікаў, [illegible], Цэўчук, Ходзякова, Юзьвіг, Чарнабродаза, Хайтовіч, Самусенка, Пугодзін, Чахновіч, Федулаў, Шчэмлёў, Хаталенка, Гурчонак, Лабанок, Грыбаў, Лацыс, Вайнэр, Скробут, Бачаро, Зерніс.

Мандатная камісія

Міцькоў, Тамашэўскі, Гурэвіч Л., Шыдлоўскі, Баль, Гаруновіч, Калодка, Бурава, Аляксеяў, Хандогі, Гайдукевіч, Муляўка, Клімчук, Гілякевіч, Берзінг, Грынберг Л., Крохмаль.

Сакратарыят

Будзінскі, Каменштэйн, Ульляная, Рэмізэвіч, Арашчук, Платун, Валковіч, Браўковіч, Розін, Кангізэр, Гурэвіч, Сапун, Эпштэйн, Мяцуеў, Балцін, Шапіра, Матусаў, Вайман, Гаварухін, Тарасаў.

Рэдакцыйная камісія

Асьмоў, Якаўлеў, Канакоцін, Саевіч, Танхілевіч, Сэрбэнта, Рэвінскі, Шчарбакоў, Каранеўскі, Левін, Гродзіс, Дунец, Клыс, Некрашевіч, Азаронак, Шастакоў, Шукевіч, Грэцьцікоў, Цэнцыпер, Сташэўскі, Крыцін, Балашоў.

У ганаровы прэзыдыум зьезд аднадушна пад бурныя воплескі выбраў т.т. СТАЛІНА, МОЛАТАВА, КАГАНОВІЧА, ВАРАШЫЛАВА, КАЛІНІНА, РЫКАВА, АРДЖАНІКІДЗЕ, КУЙБЫШАВА, РУДЗУТАКА, ТЭЛЬМАНА і ЛЕНСКАГА.

Учора-ж зьезд заслухаў даклад ЦК УсеКП(б), які зрабіў тав. МАНУІЛЬСКІ.

Зьезд пастанавіў паслаць прывітальныя тэлеграмы тав. Сталіну, ЦК УсеКП(б), «Правде», ЦК КП Польшчы і ЦК КПЗБ.

Пад правільным кіраўніцтвам партыі мы дасягнулі вялікіх посьпехаў

Рапарт XIII зьезду КП(б)Б і XVI зьезду УсеКП(б)

АД РАБОТНІКАЎ І РАБОЧЫХ ВІЦЕБСКАЙ ДЗЯРЖАЎНАЙ ПАНЧОШНА-ТРЫКАТАЖНАЙ ФАБРЫКІ ІМЯ КЛАРЫ ЦЭТКІН

Прымаючы ўдзел разам са ўсёй рабочай клясай СССР у будаўніцтве сацыялізму нашага краю і ў вяжыцьцяўленьні задач, высунутых партыяй па ўзмацненьні тэмпаў індустрыялізацыі краю і перабудове сельскай гаспадаркі, мы да XIII партзьезду КП(б)Б і XVI зьезду УсеКП(б) маем наступнае:

1. Наша фабрыка, пабудаваная ў гады рэвалюцыйнай барацьбы, з кожным днём пашыраецца. Пачаўшы работу з 80-цю работніцамі на ручных машынках, якія выпрацоўвалі 8 пар панчох за рабочы дзень, мы зараз маем 1.700 работніц і рабочых, якія працуюць на 12-ці аўтаматах кожны і выпрацоўваюць ПА 350 ПАР ПАНЧОХ ЗА РАБОЧЫ ДЗЗЕНЬ.

2. З 1-га студзеня 1930 году фабрыка пераведзена на 7-гадзінны рабочы дзень і ў годзе працуе 360 дзён.

3. Прадукцыйнасьць працы павялічылася на 16 проц., пры павялічэньні заработнай платы на 7,5 проц.

4. Вытворчая праграма за мінулы год выканана на 102,1 проц., за першае паўгодзьдзе—на 101,6 проц., за красавік на 105,2 і за дзьве дэкады мая—на 107 проц. Зьніжэньне сабекошту за мінулы год складае 8,1 проц. супроць вызначаных 7 проц., а за першае паўгодзьдзе бягучага году—10,4 проц. супроць вызначаных 8,3 проц.

5. Прапановы рабочых выкананы на 95 проц.

За апошні год на адміністрацыйна-гаспадарчую і іншую работу выпучана 88 чалавек, з іх 76 работніц.

Для падрыхтоўкі выпучэнцаў на фабрыцы існуюць курсы на 70 чалавек.

6. Палялшаецца добрабыт рабочых. Пры фабрыцы існуе дзіцячы сад на 50 дзяцей і ясьлі на 80 дзяцей. Ясьлі працуюць ад 5 гадзін раніцы да 12 гадз. ночы. Работніца, якая пасьля работы займаецца ў школе, або занята грамадзкай працаю, мае магчымасьць пакідаць дзіця ў ясьлях.

Для рабочых пабудаваны дом, у якім жыве 12 сямей. Зараз будуецца яшчэ адзін дом на 40 кватэр. У гэтым годзе арганізаваны для рабочых фабрыкі дом адпачынку, праз які пройдзе 350 работніц і рабочых. 100 дзяцей рабочых на летні пэрыяд пасланы ў вёску для адпачынку, прычым у вёсну выехалі дзіцячы сад і ясьлі.

***

Усе гэтыя дасягненьні мы маем дзякуючы ПРАВІЛЬНАМУ КІРАЎНІЦТВУ ПАРТЫІ І ШЫРОКАМУ ЎДЗЕЛУ РАБОТНІЦ І РАБОЧЫХ У САЦСПАБОРНІЦТВЕ. Удзел рабочых у вытворчых нарадах даходзіць да 85 проц. У выніку сацспаборніцтва частка рабочых перайшла на павялічаную колькасьць машын, арганізаваны калектывы, зьмешыліся прагулы. Заключаны дагаворы на сацспаборніцтва паміж асобнымі цэхамі.

ПРАМФІНПЛЯН ДАВЕДЗЕНЫ ДА КОЖНАЙ МАШЫНЫ.

Колькасьць ударнікаў расьце і на 1 мая складала БОЛЬШ 1.000 ЧАЛАВЕК. Два разы за гэты пэрыяд праводзілася праверка сацспаборніцтва, у якой прыняло ўдзел 165 чалавек. 80 ЛЕПШЫХ РАБОЧЫХ УДАРНІКАЎ ПРЭМІЯВАНЫ на суму 2.300 руб.

Партарганізацыя за апошні час ВЫРАСЛА НА 87 АСОБ. галоўным чынам, ЗА ЛІК КВАЛІФІКАВАНЫХ І АКТЫЎНЫХ РАБОТНІЦ. Зараз ідзе далейшы рост. На 1 мая партарганізацыя налічвае 147 чалавек, камсамольская арганізацыя—287 чал.

Работніцы і рабочыя фабрыкі прымаюць актыўны ўдзел у перабудове сельскай гаспадаркі. У часе падрыхтоўкі да веснавой пасеўнай кампаніі фабрыка паслала брыгаду З 29-ці ЧАЛАВЕК. На пастаянную работу ў калгасы выпучана 7 РАБОТНІЦ. На сродні рабочых куплены для падшэфнага сельсавету трактар, трыер, двухпамешны плуг і барана. У вёсцы арганізавана хата-чытальня з радыяпрыёмнікам. Для дзяцей калгаснікаў на летні пэрыяд адчынены ясьлі.

Мацнее сувязь з ЧЫРВОНАЙ АРМІЯЙ. Усе сходы рабочых адбываюцца пры удзеле чырвонаармейцаў. У падшэфнай часьці арганізаваны вытворчы куток, у якім чырвонаармейцы шляхам гутарак знаёмяцца са спэцыфічнымі асаблівасьцямі нашай вытворчасьці. Паміж рабочымі і падшэфнай часткаю заключаны дагавор на сацспаборніцтва, на лепшае выкананьне прамфінпляну, з аднаго боку, і ўзмацненьне баявой падрыхтоўкі—з другога. Чырвонаармейцы прымалі ўдзел у праверцы выкананьня сацдагавору на фабрыцы, а рабочыя—у праверцы дагавору ў падшэфнай часьці. У часе прэміяваньня рабочых былі таксама прэміяваны чырвонаармейцы за лепшыя вынікі ў выкананьні сваіх абавязкаў па сацдагаворах.

Зараз будуецца новая фабрыка, якая будзе скончана ў 1930-31 годзе. ПАНЧОШНА-ТРЫКАТАЖНЫ КАМБІНАТ ДАСЬЦЬ ШТОГОДНЮЮ ПРАДУКЦЫЮ НА 78 МІЛЬЁНАЎ РУБЛЁЎ.

Але побач з гэтым у нашай рабоце ёсьць яшчэ рад недахопаў (наяўнасьць прагулаў—0,12 проц., нездавальняючая яшчэ якасьць прадукцыі, недахопы ў масавай рабоце і г. д.). Мы пра гэтыя недахопы ведаем, змагаемся за іх зьніжэньне і пад кіраўніцтвам камуністычнай партыі мабілізуем масы рабочых вакол выкананьня генэральнай лініі партыі.

Галоўны лёзунг партыі—«Выкананьне пяцігодкі за чатыры гады»—НАМІ БУДЗЕ ВЫКАНАНЫ.

Па даручэньні агульных сходаў рабочых

ДЭЛЕГАЦЫЯ.

Новая антысавецкая брахня з-пад падворотні польскага фашызму

Пілсудчына заклікае да паўтарэньня „паходу на Кіеў"

НОВАЯ ХВАЛЯ АНТЫСАВЕЦКАЙ КАМПАНІІ

Апошнія выступленьні афіцыйнага органу пілсудчыкаў «Газэты Польскай», ад якіх мы падаем ніжэй, павінны прыцягнуць пільную ўвагу савецкай грамадзкасьці. Польскі афіцыёз выводзіць на сьвет самыя брудныя выдумкі (якія добра аплачваюцца міжнароднай контр-разьведкаю) Бесядоўскага для новага цкаваньня савецкага поўнамоцнага прадстаўніцтва ў Варшаве. Польскі афіцыёз друкуе самую бессэнсоўную, самую дурную выдумку аб «замахах» супроць Пілсудзкага, якія нібы-та рыхтаваў забіты белагвардзейцамі ў Польшчы т. Войкаў.

А гэта зьяўляецца невыпадковым. У гэтым-жа нумары, дзе друкуюцца такія байкі для дзяцей малодшага ўзросту, зьмяшчаецца перадавы артыкул, у якім «Газэта Польска» адкрыта прапагандуе і агітуе за захоп Савецкай Украіны польскім імэрыялізмам.

Зноў мы чуем з вуснаў афіцыйнага органаў польскага ўраду сьцьвярджэньне аб тым, што «савецкі ўрад зьлучыцца часовым», што «за ім прыйдзе другая Расія» і т. п. фантазіі ў бессонную ноч польскіх фашыстых.

Новая хваля антысавецкай кампаніі ў Польшчы выклікана абвостраным крызісам польскага фашызму. Урадавыя колы думаюць адвярнуць увагу працоўных ад іх сапраўднага ворага—ад польскага фашызму, і прабуюць накіраваць абурэньне працоўных на сацыялістычную бацькаўшчыну суськетнага пралетарыяту—СССР.

Паглыбленьне і пашырэньне гаспадарчага крызісу ў фашысцкай Польшчы—вось сапраўдныя прычыны повае антысавецкае кампаніі. У адказ на новую хвалю антысавецкай кампаніі ў Польшчы, якая на гэты раз распачалася і вядзецца афіцыйнымі ўрадавымі органамі польскага фашызму, савецкая грамадзкасьць яшчэ больш

ПРАВАКАЦЫЯ ФАШЫСЦКАГА АФІЦЫЁЗУ

ВАРШАВА, 29. Польскі афіцыёз «Газэта Польска» друкуе вялікую перадавую, у якой, палемізуючы з нацыянал-дэмакратамі, абараняе сваю праграму наступленьня на Усход.

«Антыўная замежная палітыка Расіі, заяўляе «Газэта Польска», заключаецца ў імкненьні ўмацавацца на берагох Ціхага акіяну, што стварае ангельска-расійскае супэрніцтва. З гэтае прычыны Расія павінна ліквідаваць або падпарадкаваць сабе прыбальтыцкія дзяржавы, Што датычыцца Польшчы, дык ніякая Расія ня прымірыцца з сучаснымі польскімі межамі. Праўда, бальшавікі гэтыя межы прызналі, але бальшавікі ня вечныя».

Адсюль газэта робіць наступныя практычныя вывады:

«Сьцьвярджэньне нацыянал-дэмакратыі, што Нямеччына зацікаўлена ў адналеньні незалежнай Украіны (пятлюраўскай) нявернае. Нямеччына зацікаўлена ў адваротным. Незалежная Украіна павінна была-б змагацца з Расіяй. У гэтым змаганьні яна павінна была-б шукаць апоры ў Польшчы. На працягу многіх год незалежная Украіна была-б занадта слабай і надта зацікаўленай у польскім падтрыманьні, каб прэтэндаваць на Усходнюю Галіцыю. Але мы—пасьпешна дадае «Газэта Польска»—зусім не распальваем украінскага сэпаратызму, у чым нас абвінавачвае нацыянал-дэмакратыя. Гэта робіць... афіцыянал-прадстаўнік СССР консул Лапчынскі, які распальвае украінскі сэпаратызм у Польшчы».

Газэта падае далей прыватны ліст савецкага консула ў Львове Лапчынскага, у якім гаворыцца, што консул хацеў бы, каб заходня-украінская грамадзкая думка азнаёмілася з працэсам Яфрэмава паводле стэнаграфічных справаздач і таму прыкладае стэнаграмы.

Падаючы цытату з прыватнага ліста, «Газэта Польска» патэтычна ўдарае па сядзіць краса украінскай інтэлігенцыі (краса інтэлігенцыі, гэта... Яфрэмаў і яго таварышы), у Львове расійскі консул гаворыць аб адзінстве Заходняй Украіны з Вялікай Украінай. Консул Лапчынскі робіць тую-ж работу, якую рабіў-бы ўсякі консул Расіі, незалежна ад яе ладу. І толькі нацыянал-дэмакратыя ня хоча бачыць тых небясьпек, якія заўсёды будуць пагражаць Польшчы з боку Расіі».

Выпазка супроць нацыянал-дэмакратыі выдае польскіх мілітарыстых з галавой. Артыкул польскага афіцыёзу, нават без асаблівай расшыфроўкі, зьяўляецца ні чым іншым, як угрунтаваньнем неабходнасьці прэзэнтыўнай вайны супроць СССР, пакуль яшчэ на гэта ёсьць час.

Другая перадавая польскага афіцыёзу ў тым-жа нумары падыходзіць да польска-савецкіх адносін ужо з другога, вельмі спэцыфічнага боку. Польскі афіцыёз стараецца адразу забіць двух зайцаў: з аднаго боку тэрарызаваць польскую грамадзкую думку, якая змагаецца супроць ваеннай авантуры, а з другога — «мімаходам» заявіць, што прадстаўнікі СССР... падрыхтоўваюць тэрарыстычныя замахі ў Польшчы. Гэта апошняя акапічнасьць зьяўляецца, відавочна, падрыхтоўчым матар'ялам для сьледзтва аб замаху на савецкае поўпрэдзтва ў Варшаве. З гэтаю мэтаю «Газэта Польска» спасылаецца на «мэмуары Бесядоўскага».

«Польская грамадзкая думка, піша газэта, павінна зьвярнуць сур'ёзную увагу на расказ Бесядоўскага аб намеры Войкава забіць Пілсудзкага, тым больш, што ў «Известиях» зноў пачалося разьдзьмуханьне антыпольскіх настрояў. На гэты раз дроў падкінуў нацыянал-дэмакратычны дэпутат Беразоўскі. У Польшчы на выступленьне Беразоўскага мала хто зьвярнуў увагі, але затое аб ім ведаюць «Известия» і атрымліваюць яшчэ адзін довад, што пілсудчыкі «намераны пачаць вайну з СССР». Беразоўскі напэўна адчувае сябе кавалерам ордэну Чырвонага Сьцягу. Урэшце, гісторыя ідыліччных адносін савецкага пасольства з нацыянал-дэмакратыяй датуецца ня з сёнешняга дня. Войкаў вёў размовы з Трампчынскім і наведаў Дмоўскага. Сакратар пасольства Аркадзьеў меў шырокія вядомыя сувязі з нацыянал-дэмакратычнымі дэпутатамі. Беразоўскі ў часы Войкава і Аркадзьева добра ведаў смак савецкай ікры. Савецка-андзкаўскія адносіны ў часы Войкава-Аркадзьева былі надзвычай простыя. Аркадзьеў быў частым госьцем рэдактара «Газэты Варшавскай» Альшэўскага і шаптаўся з ім у рэдакцыйным габінэце аб пілсудчыках. Ня стала Войкава, ня стала Аркадзьева, але дух іх жыве да гэтага часу у нацыянал-дэмакратычных колах. Нацыянал-дэмакратычная прэса зараз стараецца з яшчэ большай адданасьцю, чым у часы Войкава. Выступленьні Дмоўскага былі нямалым палягчэньнем для савецкіх дыктатараў. Цяпер, калі выступленьне Дмоўскага ўжо прагучэла, выступае дэпутат Беразоўскі».

Пажар рэвалюцыі ахапляе ўсю Індыю

Масавыя забастоўкі і дэманстрацыі ў гарадох

РАБОЧЫЯ ВЫСТУПАЮЦЬ ПАД ЛЁЗУНГАМ КЛЯСАВАЙ БАРАЦЬБЫ

СТАМБУЛ, 26. Паводле атрыманых тут з Індыі вестак, толькі зараз можна ўявіць, як высока ўзьнялася хваля масавых забастовак і дэманстрацый у Індыі ў адказ на ўзмацненьне рэпрэсій супроць нацыянальна-вызваленчага руху, 5 і 6 мая бадай па ўсіх гарадох Індыі былі зачынены ўсе крамы і школы. Усюды адбыліся масавыя дэманстрацыі. Паводле вестак поўафіцыйнага агенцтва «Асошыэйтэд Прэс оф Індыя», у Калькуце і Дэлі быў поўнасьцю праведзены хартал (спыненьне ўсялякіх спраў у адзнаку жалобы), былі зачынены як мусульманскія, так і індускія крамы. Дэманстрацыя ў Лагоры, якая адбылася 5 мая, паводле слоў карэспандэнта газэты «Хінду», была самай значнай за апошнія дзесяць год. Дэманстрацыі адбыліся таксама ў Арміцары, Алдахабадзе, Карачы, Мадрасе, Гайдзерабадзе, Каўнпоры і г. д. Для дэманстрацый характэрны надзвычай актыўны ўдзел у іх рабочых. У Мадрасе, паводле слоў газэты «Хінду», у дэманстрацыі прымалі ўдзел рабочыя Мадраскай і Паўднёва-Махрацкай чыгункі, ня гледзячы на пратэст прадпрыемцаў. У Міруце працэс быў адкладзены на дзень, бо ўлады не знайшлі магчымым у гэты дзень правесьці абвінавачаных па вуліцах. Асабліва актыўны ўдзел у дэманстрацыі рабочых адзначана быў у Бамбэі. 6-та мая з 80-ці тэкстыльных прадпрыемстваў не працавала 50. Рабочыя пайшлі на прадпрыемствы, дзе работа працягвалася, і сталі пераконваць рабочых гэтых прадпрыемстваў пакінуць работу. У Парэлі 3.000 рабочых літаральна ўзялі прыступам фабрыку. Эўрапэйскія служачыя прадпрыемства адкрылі стрэльбу і параніли некалькі рабочых. Паводле прызнаньня «Асошыэйтэд Прэс оф Індыя», 6 мая ў Б

Партыйныя масы цалкам і поўнасьцю ўхваляюць тэзісы

Важ распрацоўкі перадзьездаўскіх пытаньняў мабілізаваць шырокія партыйныя масы для барацьбы за генэральную лінію партыі, супроць наскокаў на яе справа і „зьлева“

Па ячэйках КП(б)Б Кастрычніцкай арганізацыі (Менск) пачалася распрацоўка тэзісаў да XVI зьезду УсеКП(б). Амаль ва ўсіх ячэйках арганізацыі ўжо распрацаваны тэзісы тав. Якаўлева.

Райком партыі, надаючы вялікую ўвагу абмеркаваньню тэзісаў у масы, забяспечыў усе ячэйкі дакладчыкамі ад райкому. Першыя дні распрацоўкі паказалі, што на ходы зусім слаба прыцягваюцца беспартыйныя рабочыя, што рад партыйцаў слаба падрыхтаваны да распрацоўкі.

Некаторыя партыйныя ячэйкі пачалі ўжо распрацоўваць тэзісы тав. Куйбышава. Сходы партыйных ячэек, на якіх распрацоўваліся тэзісы т. Якаўлева, адбываліся за іх далучыліся.

* * *

СМІЛАВІЧЫ. (Па тэлефону). У трох вясковых парт'ячэйках ужо адбылося абмеркаваньне тэзісаў т. Якаўлева. На адкрытых сходах парт'ячэек, на якіх распрацоўваліся тэзісы, прысутнічалі калгасьнікі беднякі і сераднякі-індывідуалы. Усе пытаньні, якія закраналі тэзісамі, актыўна абмяркоўваліся сходам. Асаблівую зацікаўленасьць выклікаў пункт тэзісаў аб тым, што калгасьнікі-сераднякі зьяўляюцца апорай савецкай улады ў вёсцы.

Тэзісы цалкам поўнасьцю ўхвалены ўсім сходамі, якія адбыліся.

СЬМІЛАВІЧЫ. (Па тэлефону). На вясковых парт'ячэйках Сьмілавіцкага раёну пачалося абмеркаваньне тэзісаў тав. Якаўлева. У прыватнасьці, асабліва актыўна прайшоў адкрыты сход парт'ячэйкі ў самых Сьмілавічах, на якім прысутнічала каля 250 чал. На 80 проц. сход складаўся з беспартыйных рабочых, саматужнікаў і сялян. Прысутнічалі члены калгасу «Чырвоны Прафінтэрн».

Сход Сьмілавіцкай парт'ячэйкі аднадушна цалкам ухваліў тэзісы.

* * *

У парткалектыве заводу «Энэргія» распрацоўка тэзісаў да XVI зьезду УсеКП(б) пачалася з 26 мая. На ўсіх цэхавых ячэйках адбыліся ўжо адкрытыя сходы, на якіх распрацоўваліся тэзісы. На сходах на распрацоўцы зусім мала прысутнічае беспартыйных рабочых. Асабліва гэта датычыць ячэек механічнага і ліцейнага цэхаў.

Бюро парткалектыву забясьпечыла распрацоўку тэзісаў камуністымі і беспартыйнымі рабочымі другой і трэцяй зьмены.

Зараз праводзіцца падрыхтоўчая работа па арганізацыі гурткоў для вывучэньня і распрацоўкі матар'ялаў і пастаноў XIII зьезду КП(б)Б і XVI зьезду УсеКП(б).

Ячэйка не дала адпору антыпартыйнаму выступленьню

Распрацоўка тэзісаў да XVI зьезду ВКП(б) у партыйных ячэйках Касьяновіцкай партарганізацыі, за выключэньнем 2-3 ячэек, яшчэ не распачалася. Члены партыі ня даў дырэктыў ячэйкам аб распрацоўцы тэзісаў.

Гэтымі днямі на партсходзе мястечковай ячэйкі КП(б)Б абмяркоўваліся тэзісы. Што-ж пакажуць гэтыя перадзьездаўскія сходы і распрацоўцы тэзісаў у Касьяновіцкай арганізацыі?

На гэтым сходзе выявілася, што большасьць партыйцаў тэзісаў ня чытала, ня ведае іх, што яны больш-менш знаёмы з ім назад апублікаваны ў друку.

Не менш сходзе мела месца зусім няправільнае выступленьне камсамольца Брайніна. Ён у сваім выступленьні сказа, што апублікаваныя тэзісы т. Якаўлева не вырашаюць праблемы калгаснага будаўніцтва і г. д. Далей ён сваім выступленьнем натрабаваў, каб партыя адмовілася ад палітычнай работы сярод бяднякоў-серадняцкіх мас на падрыхтоўцы іх у калгасы, ад работы па арганізацыі беднаты. Такое выступленьне, сказуоўна, носіць праваапартуністычны характар. Партыйная ячэйка не дала належнага адпору такому выступленьню. Гэты сыгнал павінен мабілізаваць партыйную арганізацыю для барацьбы супроць усіляких наскокаў на генэральную лінію партыі з боку як правых, так і «левых» апартуністых.

ПАДАРОЖНЫ.

К. МАНГУС

Памяці бальшавіка-чэкістага

Рантоўна памёр стары бальшавік тав. Мангус Карл Іванавіч. Тав. Мангус нарадзіўся ў латышскай сям'і Ліфляндзкай губ. У 1905 годзе тав. Мангус уступіў у РСДРП (бальшавікоў). Да 1914 г. працаваў у абшарнікаў і прымаў актыўны ўдзел у партыйнай барацьбе. У 1914 г. быў забраны ў армію, дзе служыў да Лютарыцкай рэвалюцыі. Будучы ў сэрыі увесь час, і у асаблівасьці пасьля Лютарыцкай рэвалюцыі, актыўна ўдзельнічаў у рэвалюцыйнай барацьбе. Пасьля Кастрычніка тав. Мангус абараняе Савецкую старыцыю Валкскага гасавету, а з 1919 г. праходзіць добраахвотна ў рады Чырвонай арміі. З 1920 г. на аднолькавай гаспадарчай працаваў у ворганах свайго жыцьця і ВЧК АДПУ на адказных пасадах. У апошні час зьяўляўся начальнікам Аршанскага акруговага аддзелу АДПУ. Разам з працаю ў ворганах ДПУ тав. Мангус прымаў увесь час актыўны ўдзел у партыйнай рабоце, будучы бесьперапынна членам бюро АК КП(б)Б.

Раптоўная, нікім нечаканая сьмерць насьцігла яго калі ён зьбіраўся як дэлегат прыняць удзел у працы зьезду. У асобе т. Мангуса наша партыя страціла старога бальшавіка-чэкістага, нястомнага барацьбіта за перамогу сацыялізму.

В.

* * *

Бюро Аршанскага акруговага камітэту КП(б)Б і аршанская дэлегацыя XIII зьезду КП(б)Б з глыбокім жалем паведамляюць аб заўчаснай сьмерці члена бюро Аршанскага акруговага і дэлегата XIII зьезду тав. Мангуса К., якая пасьледавала 30 мая г.г., а 9 гадз. увечары ў гор. Менску.

Бюро Аршанскага АК КП(б)Б і дэлегацыя зьезду.

Да ўвагі мабілізаваных ЦК КП(б)Б у лік „60-ці“

Культпрапаганда ЦК КП(б)Б у другі раз прапануе зьявіцца на курсы № 16 да т. Ротгавай) наступным т.:

Луцкевіч (Белкаапсаюз); Сапожнікаў (ЦК металістаў); Сакольскі (Сакр. ячэйка ЦВК); Вончак (ЦВК); Бандарэнка (Акадэмія Навук); Айзенсон (Наркамфін); Маазр (Наркамасьветы); Якубчык (ВДУ); Кісялеў (Мтэхнікум); Валэйнчук (Сьвіслацкі); Бараў (Дзяржкамаль); Бояр (Дзяржкамаль).

Ухіленьне таварышоў, якія мабілізаваны згодна пастановы Сакратарыяту ЦК, ад яўкі, будзе разглядацца як парушэньне партыйнай дысцыпліны.

Акрамя таго наступныя таварышы атрымалі камандыроўкі, але да гэтага часу не зьявіліся ў рэдакцыі газэт, да якіх яны прымацаваны:

1. Захарава (Наркампрацы); 2. Гінзбург (Белкаапсаюз); 3. Смарчкоў (ВСФК).

Пытаньне аб гэтых таварышох перадаецца ў АКК.

Падрыхтоўка да збору ураджаю

На здымку: зборка складанай жняркі ў саўгасе імя 10-годзьдзя БССР на Мар'іне

Работа сяро жанчын не пераведзена на новыя рэйкі

Прайшло ўжо каля 5-ці месяцаў з часу вынясеньня выпэйшымі парторганамі пастановы аб рэарганізацыі партыйнага апарату. І зараз ужо ёсьць магчымасьць падагуліць некаторую практыку работы сярод жанчын, праведзеная пановаму. Рэарганізацыя партапарату прадугледжвала такую перабудову работы сярод жанчын, пры якой павінна павысіцца партыкіраўніцтва і адказнасьць усёй партарганізацыі за правядзеньне гэтай работы. Аднак, мы зараз спатыкаемся з такімі момантамі, якія сьведчаць, што ня ўсюды гэта перабудова сапраўды праведзена, што ёсьць рад партарганізацый, якія не зразумелі сутнасьці і значэньня гэтай рэарганізацыі.

У даным выпадку мы на канкрэтных прыкладах адпэй з арганізацый хочам паказаць, наколькі яшчэ ня ўсюды здолелі разгарнуць работу сярод жанчын, нават пасьля рэарганізацыі. Такой арганізацыяй зьяўляецца **Дубровенская** (Аршанскай акругі). Працаўнікі Дубровенскага райкому КП(б)Б лічаць, што рэарганізацыя датычыць толькі вышэйшых парторганаў: ЦК і АК і што ня мае ніякіх адносін да райкому. Калі, моў, засталіся ў раёне жанарганізатары, то, значыцца, работа сярод жанчын павінна ісьці па-старому. Калі ў адным члена бюро райкому спыталі аб выніках рэарганізацыі і работе сярод жанчын пасьля яе, то ён адказаў: «Бачыце, у нас-жа ў райкоме той самы апарат, які быў і раней». Зразумела, пры такім разуменьні задач, якія ставіла перад сабою рэарганізацыя, ніякай работы быць не магло.

У Дуброўне за кароткі пэрыяд зьмянілася некалькі жанарганізатараў, а работа ад гэтага не палепшылася, а наадварот, пагоршылася, бо па-ранейшаму яна ўсёй сваёй цяжкасьцю ўскладаецца на райжанарганізатара, а пізавыя зьвяны партарганізацыі, як і раней, не адчуваюць адказнасьці за работу сярод жанчын. В гэтае прычыны дэлегацкія сходы па ўсім раёне не працуюць: дэлегацкі сход у калгасе Барсукі разваліўся, бо ня быў забясьпечан партыйным кіраўніцтвам. Не вядзецца работа і сярод батрацка-бяднацкай часткі жанчын на вёсцы. Таму батрачкі і бяднячкі не згуртаваны вакол задач партыі, ня ўзьнята іх клясавая сьвядомасьць.

Таксама няма пералому і ў галіне культурна - бытовага абслугоўваньня жанчын раённымі савецкімі і грамадзкімі арганізацыямі. Раённае бытавое камісіі пры РВК няма. Па арганізацыі-ж ясьлям працуе, нават выконвае ўсю тэхнічную работу (абсталяваньне, падбор памяшканьняў, пэрсаналу і інш.) жанорг.

Ня лепшая справа і па Дубровенскай фабрыцы. Там таксама няма адпаведнага пералому ў парткіраўніцтве работай сярод работніц. Пасьля рэарганізацыі работы ў парткалектыве фабрыкі ліквідавалі платную адзінку жанарганізатара, а стварылі сэктары па работе сярод жанчын пры цэх ячэйках. Сэктар складаецца з аднаго чалавека, г. зн. а таго-ж самага жанорга. На гэтым з «рэарганізацыяй» у парткалектыве фабрыкі і скончылі, а работа, як зьмест, так і засталася па-старому.

На фабрыцы сярод кіруючых работнікаў няма выразнага разуменьня таго, як весьці работу сярод жанчын пасьля рэарганізацыі. Аб гэтым выразна гаворыць плян работы сярод жанчын, складзены ячэйкай ткацкага цэху. У гэтым пляне асноўныя пункты вельмі агульныя, ня маюць нічога ў сваім зьмесьце канкрэтнага. У пляне намечана праводзіць адзін раз у шэсьць тыдняў сходы работніц фабрыкі. А якія пытаньні на іх ставіць і ці мэтазгодна іх склікаць—невядома. Бо на фабрыцы з 1.000 рабочых — 700 работніц і яны заўсёды прысутнічаюць на агульных сходах рабочых. Па-другое, калі бытавая праца ўскладаецца на жанарганізатара, то што будзе рабіць сацыяльна-бытавы сэктар фабкому?

Па ўсіх гэтых пытаньнях у пляне няма выразнасьці , а яе трэба было-б унесьці.

На фабрыцы неабходна работу дыфэрэнцыяваць, неабходна прыстасоўваць яе да паасобных груп работы, бо ёсьць на фабрыцы адсталыя жанчыны, якія не разумеюць задач, што стаяць перад рабочымі на прадпрыемстве. Гэта становішча са складам рааботніц пры правядзеньні ўсёй работы трэба ўлічваць.

Паказаныя недахопы ў рабоце Дубровенскай арганізацыі характэрны і для раду другіх партарганізацый, бо ёсьць сыгналы аб гэтым-жа самым і з іншых раёнаў і прадпрыемстваў. Гэтыя адмоўныя зьявішчы трэба рашуча ліквідаваць, дабіўшыся сапраўднай перабудовы работы сярод жанчын, на аснове пастаноў партыі.

Для гэтага неабходна, асабліва зараз, у сувязі з работамі XIII зьезду КП(б)Б, шырока абмеркаваць пытаньне аб рабоце сярод жанчын у новых умовах. Бо калі ў адносінах да вёскі мы маем больш-менш выразнасьць, то пытаньне аб працы сярод работніц патрабуе дэтальнай распрацоўкі ў пізавых партарганізацыях.

Наша думка, што ў першую чаргу гэту работу сярод жанчын трэба праводзіць не наогул а ўлічваючы канкрэтныя ўмовы і асаблівасьці кожнага прадпрыемства. У першую чаргу трэба ахапіць асобнай работай адсталыя пласты і групы работніц, якія толькі што ўлілісь на вытворчасьць. Тут, безумоўна, значнае месца павінны заняць дэлегацкія сходы, якія павінны дапамагаць і садзейнічаць клясаваму і вытворчаму выхаваньню гэтых груп работніц, мабілізуючы іх актыўнасьць на выкананьне прамфінпляну і ўздым вытворчасьці. Другім важнейшым момантам зьяўляецца работа з актывам работніц. Яна павінна весьціся сыстэматычна як партарганізацыяй, так і прафсаюзамі. Асобную работу трэба весьці і па падрыхтоўцы ўдарніц у партыю, бо на гэтым вучастку мы значна адстаем. Бытавой, вытворчай і культурнай рабоце трэба аддаць больш увагі, трэба лепш кіраваць работай адпаведных сэктараў. Сацыяльна-бытавы сэктар павінен займацца пытаньнем быту работніц (ясьлі, сады, дзіцячыя пакоі), вытворчы — кваліфікацыяй работніц і прыцягненьнем іх да рацыяналізатарскіх мерапрыемстваў, культурны сэктар — вучобай і ліквідацыяй няпісьменнасьці сярод работніц.

На вёсцы асноўным момантам зьяўляецца павышэньне адказнасьці партарганізацый за правядзеньне работы сярод жанчын, актывізацыя работы дэлегацкіх сходаў у пытаньнях калектывізацыі і барацьбы з кулацтвам, наладжаньне сыстэматычнай работы з жанчынамі ў групах беднаты і ў калгасах, правядзеньне работы з актывам савецкімі і грамадзкімі арганізацыямі.

Усе гэтыя закранутыя пытаньні работы сярод жанчын павінны знайсьці шырокі абмен практыкай і абгаварэньне на старонках нашага друку

Г. РАГАЗІНІКАВА.

Прамысловасьць і сельская гаспадарка Віцебшчыны да XIII зьезду КП(б)Б

(Да вынікаў VI Віцебскай акрпартканфэрэнцыі)

Віцебская VI акруговая партыйная канфэрэнцыя, якая гэтымі днямі скончыла свае работы на аснове шырока разгорнутай самакрытыкі, адзначыла рад недахопаў, якія мелі месца за мінулы пэрыяд паміж XII і XIII зьездамі КП(б)Б на асобных вучастках будаўніцтва ў Віцебшчыне.

Разам з гэтым канфэрэнцыя канстатавала рад вельмі значных дасягненьняў, якія сьведчаць аб пасьпяховым разгортваньні сацыялістычнага будаўніцтва ў акрузе.

За мінулы пэрыяд рабочая кляса Віцебшчыны вырасла на 44 проц., у адпаведнасьці з гэтым разьвілася і сама прамысловасьць, яе вытворчасьць і выпрацоўка. Аб тэмпах гэтага росту сьведчаць наступныя пікаторыя даныя: выпрацоўка рэспубліканскай прамысловасьці на бягучы 1929-30 год павялічваецца ў параўнаньні з выпрацоўкай за 1928-29 год, прыкладна, на 45 проц. За пэрыяд паміж XII і XIII зьездамі пушчана ў ход многа цэхаў, агрэгатаў і варштатаў, якія ўзмацнілі базу далейшага сацыялістычнага разьвіцьця акругі.

Пачата і ўжо набліжаецца да канца будаўніцтва буйных прадпрыемстваў (алейня, швейная і панчошная фабрыкі), якія ўбіруць у сябе новыя тысячы новых рабочых.

Аб узмоцненым руху ўперад па шляху сацыялістычнага будаўніцтва сьведчаць таксама даныя аб выкананьні прамфінпляну прадпрыемствамі Віцебшчыны. На буйнейшых прадпрыемствах рэспубліканскай прамысловасьці выпрацоўка ў першым паўгодзьдзі бягучага году перавысіла адпаведнае выкананьне прамфінпляну ў першым паўгодзьдзі 1928-29 году амаль на 70 проц.

Канстатуючы гэтыя бясспрэчныя посьпехі, неабходна, аднак, разам з гэтым адзначыць цэлы рад прарываў, на задачы зьвяшчэньня якіх партыйная канфэрэнцыя мабілізавала ўсю актыўнасьць і ўвагу партыйнай арганізацыі і рабочых мас Віцебшчыны.

Дынаміка выкананьня прамфінпляну ў бягучым годзе па прадукцыі паказвае рост процанту выкананьня яго ў другой квадры ў параўнаньні з першай. Аднак, за паўгодзьдзе ў цэлым прамфінплян у бягучым годзе недавыканан па прадукцыі, прыкладна, на 4 проц.

Апрача таго, красавік месяц, г. ё. першы месяц 3-яй квадры бягучага году, выявіў новыя тэндэнцыі ў галіне выкананьня прамфінпляну, а іменна: тэндэнцыі зьніжэньня тэмпаў яго выкананьня, паставіў прамысловасьць Віцебшчыны пад пагрозу зрыву прамфінпляну.

Побач з гэтым асабліва моцнае адставаньне ў выкананьні прамфінпляну наглядаецца ўвесь час на якасных паказальніках (павышэньне прадукцыйнасьці працы і зьніжэньне сабекошту).

З усімі гэтымі зьявішчамі адставаньня партарганізацыі рабочыя масы і кіруючыя органы ўвесь час упарта змагаліся, дасягнуўшы значных у гэтым кірунку посьпехаў.

У барацьбе з гэтымі зьявішчамі рос і разьвіваўся энтузіязм рабочых мас, які выліўся ў шырокую хвалю сацыялістычнага спаборніцтва і ўдарніцтва. У даны момант пралетарыят Віцебшчыны спаномант пралетарыят Віцебшчыны спаборнічае з рабочымі масамі буйнейшых прамысловых дэнтраў Саюзу. На прадпрыемствах акругі зараз налічваецца звыш 14.000 ударнікаў, з якіх многія паказваюць сапраўдныя прыклады сапраўднай камуністычнай працы.

Партканфэрэнцыя мабілізавала вакол задач сацыялістычнага будаўніцтва ўсю актыўнасьць рабочых мас, выявіўшы новыя крыніцы энэргіі, выклікаўшы новы пад'ём творчага энтузіязму.

Усё гэта надае ўпэўненасьць, што прарывы, якія ёсьць у галіне выкананьня прамысловых заданьняў, будуць зьвяшчаны і прамысловасьць акругі выканае ўсе ўзложаныя на яе задачы, усямерна дапамагаючы выкананьню пяцігодкі за чатыры гады.

Асаблівасьці сельскай гаспадаркі Віцебшчыны, хутарская спадчына Сталыпінішчыны, «усугубленая» «прыпэпаўпічнай» рабілі надта цяжкім працэс калектывізацыі і тэхнічную рэканструкцыю сельскай гаспадаркі акругі.

Усё-ж і ў гэтых адносінах VI акруговая партканфэрэнцыя мела магчымасьць канстатаваць назіўнасьць значных посьпехаў. Разьмеры калектывізацыі ў даны момант дасягнулі 14,5 проц. супроць 4,2 проц. на 1-е кастрычніка бягучага году.

Аднак, побач з гэтымі посьпехамі канфэрэнцыя паказала на цэлы рад праваляў у гэтай галіне, якія зьявіліся вынікам перагібаў і адміністраваньня з боку раду партыйных ячэек і асобных працаўнікоў.

Гэтыя перагібы прыпынялі пасьпяховую калектывізацыю і выклікалі адліў большай часткі серадняку з калгасаў. Кіруючыя органы Віцебшчыны дапусьцілі некаторую марудньасьць у адносінах зьвяшчэньня гэтых недапушчальных зьявішч, якія супярэчаць генэральнай лініі нашай партыі.

Канфэрэнцыя мела магчымасьць канстатаваць, што своячасова ўзьнятая ЦК барацьба з перагібамі і адміністраваньнем, практычная работа арганізацыі па выпраўленьні дапушчаных памылак і перагібаў дала магчымасьць хутка зьвяшчыць са шляху калектывізацыі ўсё тое, што перашкаджала нармальнаму ж разьвіцьцю, усё тое, што паражала парушэньню саюзу паміж рабочай клясай і беднатой з серадняком.

Упер-прышыбеевы, напрыклад, Гарадоцкія, якія насаджвалі калгасы, праводзілі «месячнік калектывізацыі» і г. д., былі зьняты з работы, як няздольныя праводзіць лінію партыі.

Партыйная арганізацыя своячасова дала рашучы адпор правым апартуністым і «левым» загібшчыкам, якія жадалі адказнасьць за свае памылкі і перагібы пераваліць на партыйнае кіраўніцтва.

Веснавая сяўба, ня гледзячы на рад труднасьцяй, праходзіць параўнальна пасьпяхова, пасылае ўпэўненасьць, што асноўныя задачы бальшавіцкай сяўбы бягучай вясны па Віцебшчыне будуць выкананы.

Далейшыя шляхі рэканструкцыі сельскай гаспадаркі Віцебшчыны ляжаць у напрамку спэцыялізацыі акругі, як ільнаводна-жывёлагадоўчай, у напрамку будаўніцтва буйной сельска-гаспадарчай індустрыі і разьвіцьця здабываючай прамысловасьці, якая базуецца на мясцовым сырцы, што знаходзіцца ў нетрах акругі (торф і г. д.).

На жаль, да гэтага часу на гэтыя асноўныя праблемы сацыялістычнай рэканструкцыі акругі не зварачалася выстарчальнай увагі.

Сельская гаспадарка не спэцыялізавалася ў асноўных напрамках, вызначаных усімі прыроднымі і эканамічнымі ўмовамі акругі.

Гэта прывяло да заняпаду ролі акругі па асноўных галінах яе сельскай гаспадаркі. Віцебшчына, напрыклад, да рэвалюцыі ў ільнярстве займала пятае месца ў Расіі. Цяперашняя Віцебская акруга далёка адышла ад гэтай пазыцыі. Тое-ж самае адарылася і па лініі жывёлагадоўлі.

Палітычнае і гаспадарчае значэньне гэтай задачы да гэтага часу на Віцебшчыне слаба ўлічваецца. Да гэтай справы ў раёнах адносіліся пасьпяхова. Аб гэтым сьведчыць хаця-б такі факт, як зрыў месячніка жывёлагадоўлі ў акрузе.

У надавычай зачатковым стане знаходзіцца с.-г. індустрыялізацыя Віцебшчыны. У акрузе няма, напрыклад, ніводнага ільнаапрацоўчага заводу. Пачата пабудова аднаго заводу, але па волі цэнтральных устаноў ён будуецца ўжо 3-ці год і невядома, калі будаўніцтва яго будзе скончана.

Трэба адзначыць, што праблема спэцыялізацыі сельскай гаспадаркі Віцебшчыны і яе індустрыялізацыі не заваявалі яшчэ належнай увагі з боку цэнтральных савецкіх і гаспадарчых устаноў.

Канфэрэнцыя актывізавала ўвагу партарганізацыі на гэтых важнейшых палітычна-эканамічных задачах сацыялістычнага будаўніцтва ў акрузе, вызначыўшы канкрэтныя шляхі іхажыцьцяўленьня.

Да XIII зьезду КП(б)Б Віцебская арганізацыя прыходзіць з актывам значных дасягненьняў, з поўным разуменьнем тых недахопаў і прарываў, на зьвяшчэньне якіх паміна быць у далейшым зьвернута ўся ўвага арганізацыі і рабочых мас акругі, і з ясным усьведамленьнем новых задач, якія ўзмацняюць базу сацыялістычнай рэканструкцыі акругі.

Арганізацыя ўпэўнена, што пад неаслабным кіраўніцтвам ЦК яна з гэтымі задачамі справіцца, няўхільна і надалей праводзячы генэральную лінію партыі.

Я. ПАЙКІН.

СЬМІЛАВІЦКІ РАЁН УСЬЛЕД ЗА КАПЫЛЕМ СКОНЧЫЎ СЯЎБУ

Зрух у сяўбе на Аршаншчыне

Пасеўная плошча пашырана на 15%

СЬМІЛАВІЧЫ. (Па тэлефону). 29 мая Сьмілавіцкі раён скончыў сяўбу. Веснавы пасеўны плян выкананы на 100 проц., як калгасамі, так і індывідуальным сэктарам. Яравы клін у раёне пашыраны на 15 проц.

Становішча палепшылася

Сыгнал аб небясьпецы на пасеўным фронце ў Аршаншчыне, які быў даны «Зьвяздой» і маскоўскім друкам, зрабіў поўны ўплыў. Акруговыя зямельныя работнікі адразу-ж паслалі сваіх прадстаўнікоў на месцы. Жорсткая крытыка недахопаў сяўбы ў друку і барацьба з перагібамі дапамаглі выправіць становішча. Аб гэтым сьведчыць хаця-б той факт, што на 25 мая ўся акруга ў цэлым выканала пасеўны плян па 61,2 проц Значна падцягнуліся індывідуальнікі, якія зьяўляліся самым слабым вучасткам пасеўнага фронту ў акрузе. На 25 мая яны далі 60,1 проц. пляну. Як паведамлялася, на 10 мая акруга ў цэлым дала толькі 16,2 проц. пляну (калгасы—21,9 проц., а індывідуальнікі—15,3 проц).

Пералом у індывідуальным сэктары тлумачыцца, галоўным чынам, ліквідацыяй скрыўленьняў у галіне зямляўпарадкаваньня. На 10 мая ў акрузе налічвалася 1.112 індывідуальных гаспадарак, якія ня прыступілі да сяўбы. На 20 мая гэтая колькасьць зьнізілася да 477. На 25 мая няма яшчэ дакладных вестак, але ёсьць падставы меркаваць, што і апошняя лічба за мінулую дэкаду яшчэ больш зьменшылася.

Аднак, у некаторых раёнах ґ на сёньняшні дзень ня ўсе індывідуальныя гаспадарні прыступілі да сяўбы. Часткова гэта тлумачыцца тым, што ў пэўных сельсаветах скрыўленьні яшчэ не ліквідаваны.

Мясцовыя арганізацыі не павінны супакоіцца на дасягнутых посьпехах, рашуча працягваць барацьбу з перагібамі і выпраўляць дапушчаныя скрыўленьні. Адначасова трэба прыняць меры, каб правільна адведзены індывідуальным гаспадаркам яравы клін не застаўся незасеянным у выпадку, калі той ці іншы індывідуальнік не апрануе яго.

В.

Колькі-ж закантрактавана?

МАЗЫР.—Кантрактацыя ў Мазырыншчыне напярэдадні поўнага зрыву. Выкананьне пляну па паасобных відах культур складае ад 8 да 40 проц. Асабліва дрэнна ідзе кантрактацыя бульбы, тэхнічных культур, махоркі.

З боку акрпаляводсаюзу, садсаюзу і іншых відаў каапэрацыі не аддаецца патрэбная увага пытаньням кантрактацыі. Грамадзкая ўвага таксама не мабілізавана.

Цікава, што ў самым Мазыры нельга выявіць дакладна, колькі фактычна закантрактавана па розных культурах.

М. В.

Скарыстаць спажывецкую каапэрацыю

У радзе округ пры рэарганізацыі сыстэмы сельска-гаспадарчай каапэрацыі раённыя ўстановы не ўдзялялі ніякай увагі арганізацыі першапачатковых вытворчых аб'яднаньняў. Вынікам гэтага зьявілася тое, што пасьля адліву з калгасаў індывідуальны сэктар застаўся амаль што зусім неабслугоўваемым.

Сялянам прыходзіцца езьдзіць па плут, насеньне і інш. у райкалтасаюз за 30-35 вёрст ад свае вёскі. Гэта, зразумела, зусім ненармальна і адбіваецца на рэалізацыі сродкаў вытворчасьці.

Пакуль ня скончылася пасеўная кампанія і не арганізаваны першапачатковыя вытворчыя т-вы, мэтазгодна было-б, каб Белпаляводсаюз дагаварыўся з Белкаапсаюзам аб арганізацыі прасоўваньня сродкаў вытворчасьці праз спажывецкую сетку.

Л.

Барацьба супроць апартунізму ў пэрыяд паміж XV і XVI зьездамі УсеКП(б)*)

Партыя змагалася ў пэрыяд паміж XV і XVI зьездамі самым рашучым чынам супроць апартунізму на практыцы, супроць самых розных апартуністычных скажэньняў. Правыя апартуністы, гледзячы, напрыклад, на ватнікам, а часамі і апартуністычныя скажэньні лініі ў разьмеркаваньні прыбытку, былі галоўнай буржуазных элементаў на нашых нарадзьдзях. Сюды-ж адносіцца правядзеньне 7-гадзінных пэрачаньні супроць мастаратоўка пры скарачэньні капітальнага будаўніцтва на мінімальныя прэрыў «абектыўных» выкананьня плану; адмаўленьне посьпехі да сацыялістычнага, пагарджаньне аб'ектыўкі новых кадраў, коснасьць у адносінах дзяржапарату і г. д.

Відома, барацьба і тут на два фронты: супроць зьяўленьня правых, калі прыхільнікі і прыхільнікі ў ўмацаваньне масьцяй буржуазіі, і супроць далёкавых сацыялістычнага будаўніцтва.

У галіне сельскай гаспадаркі партыя змагалася рашучым чынам з правыя апартуністычныя спробамі затрымаць рост калгасаў спробамі надмеры, якія маюць нічога ў сваім зьмесьце.

*) З артыкулу, які ў часопісі «Большевік» будзе надрукаваны ў часопісі «Большевік», што выходзіць у пэрыяд паміж XV і XVI зьездамі.

Правыя апартуністы, гледзячы, напрыклад, на ватнікам, а часамі і апартуністычныя скажэньні лініі ў разьмеркаваньні прыбытку, былі галоўнай буржуазных элементаў на нашых нарадзьдзях. Сюды-ж адносіцца правядзеньне 7-гадзінных пэрачаньні супроць мастаратоўка пры скарачэньні капітальнага будаўніцтва на мінімальныя прэрыў «абектыўных» выкананьня плану; адмаўленьне посьпехі да сацыялістычнага, пагарджаньне аб'ектыўкі новых кадраў, коснасьць у адносінах дзяржапарату і г. д.

Відома, барацьба і тут на два фронты: супроць зьяўленьня правых, калі прыхільнікі і прыхільнікі ў ўмацаваньне масьцяй буржуазіі, і супроць далёкавых сацыялістычнага будаўніцтва.

У галіне сельскай гаспадаркі партыя змагалася рашучым чынам з правыя апартуністычныя спробамі затрымаць рост калгасаў спробамі надмеры, якія маюць нічога ў сваім зьмесьце

ЛІСТОК РАБОЧА-СЯЛЯНСКАЙ ІНСПЭКЦЫІ

ГЭРОІ БЮРАКРАТЫЗМУ І ЦЯГАНІНЫ

Ачышчаны ад бюракратаў і чужых элемэнтаў апарат Наркамгандлю здолее змагацца за баявыя тэмпы сацыялістычнага будаўніцтва

Папярэднія вынікі праверкі апарату Наркамгандлю

Праверка апарату Наркамгандлю закончана. Пры абмеркаванні вынікаў камісіі на агульным сходзе супрацоўнікаў Наркамгандлю і гандлёва - кааперацыйных устаноў, у спрэчках ніхто не супярэчыў, супроць вываду, зробленых камісіяй. Але некаторыя супрацоўнікі Наркамгандлю, згадкаючыся з вываду, рабілі спробу зваліць віну на сістэму і аб'ектыўныя прычыны і нават на тое, што іх «блытаў Наркамгандлю СССР». Бязумоўна, такія спробы ёсьць нішто іншае, як нежаданьне крыцаць свае памылкі і зьняць з сябе адказнасьць за дрэнную пастаноўку работы Наркамгандлю. Зусім забываюць, што сыстэма залежыць ад арганізацыйнай работы апарату і ад людзей, а не ад аб'ектыўных прычын.

У часе працы камісіі выяўлена зусім ясна, што з боку большасьці супрацоўнікаў Наркамгандлю ня было праяўлена жаданьне ўскрыць свае памылкі, недахопы, дапамагчы камісіі выпрацаваць мерапрыемствы па перабудове нашага работы апарату — ад чыста апэрацыйных функцый да плянавага абмену паміж горадам і вёскай.

Асноўныя недахопы апарату Наркамгандлю заключаюцца ў наступным:

а) апарат не перабудаваўся і не прыгасаваў сваёй працы да выкананьня пастаўленых перад ім задач;

б) слабое рабочае і партыйнае ядро апараце, а адсюль адсутнасьць клясавай чуласьці, неразуменьне палітыкі партыі і ўраду некаторымі супрацоўнікамі, якія займаюць адказныя пасады, сюль і галаваціпскія, палітычнатоднымі дырэктывы, як абагульваньне дрэй, забарона продажу прадуктаў сялянамі, што па сутнасьці прывяло да зьмяньненьня рынку у некаторых мясцох БССР;

в) адсутнасьць выразнасьці пры разьмеркаваньні абавязкаў і работы паміж собнымі групамі і адказнасьці асобных кіраўнікоў груп за сваю працу;

г) невыканаўненьне правоў і абавязкаў гандлю і адсутнасьць жывога кіраўніцтва імі — зводзіла іх работу да дрэзяй, а часамі да шкодных дырэктыў лініі каапэрацыі і інш.;

д) выкананьне дырэктыў вышэйшых органаў і праверка сваіх пастаноў у Наркамгандлі зусім адсутнічае. Можна зьвесьці цэлы рад прыкладаў, калі ўрміновыя дырэктывы ўрадовых органаў ня выконваліся зусім, або выконваліся са значным спазьненьнем.

Наогул работу апарату Наркамгандлю трэба карэнным чынам перабудаваць, неабходна, каб кожны кіраўнік групы і адказнасьць за сваю працу і не хаваўся за плечы наркома і шматлікіх бюракратычных міжведамственых нарад, чаго іначай, як перастрахоўкай, чыніць нельга. Патрэбна правесьці ў жыцьцё пастанову XVI парт. канфэрэнцыі, якая дала цьвёрдую і выразную дырэктыву ў гэтым пытаньні і, відаць, незразумелую ні кіраўніцтву Наркамгандлю, ні супрацоўнікам.

Бюракратызм у Наркамгандлі існуе ў тым, што яго работа да гэтага часу ня была ўзята пад кантроль рабочых мас, замакрытыка ўнутры апарату адсутнічае. За ўвесь год у пасьленняй газэце няма артыкулаў, якія-б высьвятлялі недахопы ў пастаноўцы работы наогул галаваціпствы паасобных працаўнікоў. Адсюль неабходна зрабіць вывад, б на далейшы час Наркамгандаль павінен абгаварэньне рабочых сходаў жнейшыя свае мерапрыемствы.

Старшыня камісіі па праверцы і чыстцы апарату Наркамгандлю
КУДЗЕЛЬКА.

Экспарт і імпарт—без кіраўніцтва

Аб значэньні экспарту для народнай гаспадаркі краіны гаварыць ня прыходзіцца. Здавалася-б, што на гэтае сур'ёзнае пытаньне Наркамгандлю трэба было зьвярнуць максымум увагі. Між тым, брыгады па праверцы работы Наркамгандлю выявілі рад вялікіх недахопаў, якія ні ў якім разе не маглі спрыяць разьвіцьцю экспарту па БССР.

Экспартны плян недастаткова ўвязан з загатоўчымі плянамі. Экспартная група ўнутры Наркамгандлю адарвана ад яго загатоўчых груп. Па сутнасьці экспартная група зьяўлялася ня кіруючай, якая павінна была кіраваць экспартуючымі арганізацыямі, а тэхнічай фіксуючай становішча экспарту.

Пры наяўнасьці вялікай колькасьці зусім непатрэбных нарад па пытаньнях ня сур'ёзных, экспартны плян БССР не абмяркоўваўся кіруючымі асноўнымі працаўнікамі наркамату. Адгэтуль недастатковая ўвязка гэтага пляну з іншымі апэрацыйнымі плянамі Наркамгандлю.

Пытаньням выяўленьня новых відаў экспарту і паньрэньня існуючага экспарту не ўдзялялася дастатковай увагі як з боку Наркамгандлю, так і з боку экспартуючых арганізацый.

Навуковыя сілы і навуковыя ўстановы БССР да пытаньняў выяўленьня новых відаў экспарту ня прыцягнуты. Гэта тлумачыцца тым, што ў Наркамгандлі адсутнічала плянавая работа.

Асобна належыць адзначыць адсутнасьць якой-бы там ні было фактычнай каверкі работы экспартуючых арганізацый за ўвесь час існаваньня Наркамгандлю. Гэта зусім недапушчальна, калі ўлічыць, што экспартуючыя арганізацыі працуюць ня добра.

Наркамгандлю не займаўся зусім пытаньнем зьнімэньні выдаткаў на экспарце, а гэта асноўная работа Наркамгандлю, як плянуючага органу. Сац. спаборніцтва па экспартным плане разгорнута ня было. Грамадзкая думка班коп экспарту недастаткова мабілізавана.

Усё гэта сьведчыць аб тым, што кіраўніцтва экспартнай працай з боку Наркамгандлю пастаўлена кепска.

Яшчэ горшая справа з імпартам.

Уся роля Наркамгандлю зводзілася да пісаньня папер. Ніякага плянаваньня імпарту як з боку Наркамгандлю, і з боку Дзяржпляну ня было. Як Наркамгандаль, так і Дзяржплян штампавалі заяўкі ведамствам на імпарце бяз усякай праверкі гэтых заявак, вывучэньня іх з боку мэтазгоднасьці гэтага імпарту.

Пры гэтым трэба адзначыць, што пры існуючай сыстэме імпартнай работы арганізацый (ВСНГ) падаюць свае заяўкі на імпарт раней, чым імі складаюцца прамфінпляны. Пры такім становішчы цяжка сапраўды вынайць мэтазгоднасьць імпарту, першачарговасьць яго. Трэба сказаць, што ў БССР пры зацьвярджэньні імпартных заявак, зусім не вылучэнцца магчымасьці разьмеркаваньня гэтага імпарту па саюзнай прамысловасьці.

Апэрацыйнай арганізацыяй па імпарце зьяўляецца Дзяржгандбел, і вось Наркамгандаль за ўвесь час не праяўляў гэту арганізацыю. Наркамгандаль ні разу не праверыў мэтазгоднае скарыстаньне імпартнага абсталяваньня, хаця-б па гандлёвай і каапэрацыйнай сыстэме.

С.

«Устанаўленьне выразнага разьмеркаваньня работ паміж выканаўцамі і адказнасьці кожнага з органаў і кожнай са ставчых на любой савецкай пасадзе асоб за выкананьне пэўных заданьняў і практычных работ, зьяўляецца адным з самых важных умоў паляпшэньня работы апарату і забесьпячэньня сапраўднай магчымасьці праверкі выкананьня. Павінна быць рашуча спынена в маючай да гэтага часу надзвычайна шырокае распаўсюджваньне падменай вырашэньняў пытаньняў у межах сваіх праў і абавязкаў адказным органам і ўнутры органу адпаведным выканаўцам—рашэньнямі шматлікіх безадказных як міжведамственых, так і ўнутрыведамственых камісій, паколькі такі мэтад вырашэньня пытаньняў кіраўніцтва ня толькі не зьяўляецца спосабам уцягненьня шырокіх рабочых мас у кіраўніцтва, але і перашкаджае яму, ствараючы, шляхам узаемнай перастрахоўкі працаўнікоў дзяржаўнага апарату, паўнейшую іх безадказнасьць, робячы апарат недаступным кантролю шырокіх мас, зьні шчаючы, якую-б там ні было магчымасьць сапраўднай праверкі выкананьня. Неабходна бязьлітасная барацьба супроць пануючай расплыўлівасьці і няяснасьці ў пытаньні аб тым, што кожнаму паасобку даручана, і супроць вынікаючай адсюль паўнейшай безадказнасьці» (ЛЕНІН, Зборн. аб паляпшэньні дзяржапарату, стар. 78).

(З пастановы XVI парт. канф. па пытаньнях аб выніках і бліжэйшых задачах барацьбы з бюракратызмам).

Горшы від бюракратызму

Аб рабоце групы прамтавараў на чале з тав. **Найдусам** ужо пісалі, і ня раз. Але-ж тыя дэфэкты, якія былі выяўлены ў пачатку праверкі, блядзяюць перад тымі грубымі памылкамі і бюракратычнымі скажэньнямі, якія ў асноўным характарызуюць работу гэтай групы.

Адсутнасьць клясавых установак і якіх-бы там ні было прынцыпаў у справе разьмеркаваньня тавараў

Адна з найбольш важных задач групы прамтавараў Наркамгандлю, як плянаваньне завозу прамтавараў, ажыцьцяўлялася механічна ў тым сэнсе, што гэтыя пляны адбівалі толькі асноўныя моманты разьмеркаваньня прамтавараў паміж горадам і вёскай. Што датычыць пытаньня клясавага разьмеркаваньня тавараў унутры паасобных сэктараў, дык гэты момант не знайшоў ніякага адбітку ў плянах групы. Так, напрыклад, па гарадзкім сэктары няма ні толькі ніякіх паказаньняў наконт клясавага разьмеркаваньня тавару паміж паасобнымі групамі рабочых, але-ж нават няма паказаньняў наконт разьмеркаваньня тавараў паміж рабочымі, служачымі і іншымі коламі гарадзкога насельніцтва. Такое-ж становішча мы маем і ў адносінах да сельскага сэктару; толькі ў лютым месяцы група прамтавараў сумесна з Белкаапсаюзам распрацавала праект, які прадугледжвае некаторыя клясавыя ўстаноўкі ў справе разьмеркаваньня тавараў унутры сельскага сэктару. Такім чынам, практыка клясавага разьмеркаваньня тавараў, якая характарызуецца, да рэчы кажучы, радам памылак, праходзіла міма кіруючага ўплыву з боку Наркамгандлю.

Ва ўмовах напружанага становішча рынку мануўраваньне прамтаварамі па асобных раёнах мае вялізарнае значэньне. Але-ж і тут у плянах групы прамтавараў няма ніякіх прынцыпаў, карэктуючых параёнае разьмеркаваньне тавараў. У выніку гэта група ня мела ніякага ўплыву на разьмеркаваньне прамтаварных фондаў ня толькі па асобных раёнах (загатоўчыя, раёны разьвітай кантрактацыі с.-г. прадукцыі і інш.), але-ж і па асобных акругах. Зусім зразумела, што пры такой сыстэме работы, вылучэньне прамтаварных фондаў для загатовак праводзіцца выпадкова, бяз сыстэмы і прадуманасьці.

Няма выразнасьці ў справе рэгуляваньня рынку

Вельмі часта група прамтавараў дае арганізацыям зусім нявыразныя дырэктывы наконт прэміяваньня загатовак. 8-V 30 г. група прамтавараў прапанавала Белкаапсаюзу даць паказаньні Слуцкаму аддзяленьню аб прэміяваньні загатовак каменю. Зразумела, што для выкананьня гэтай дырэктывы Белкаапсаюз павінен быў ведаць размеры загатовак і прамтавараў, вылучаных на гэта, але-ж аб гэтым ніякіх паказаньняў у дырэктыве групы прамтавараў няма, і Белкаапсаюз павінен быў «гадаць на кофейной гуще».

Далей, 14-IV 30 г. група прамтавараў прапануе Белкаапсаюзу вылучыць прамтаварныя фонды для прэміяваньня цэлага раду загатовак, і ў тым ліку загатовак шыцак, калі збор апошніх быў ужо скончан. Зразумела, што дырэктыва групы прамтавараў у частцы шыцак ня была выканана.

Група прамтавараў вельмі часта разьмяркоўвала няісную ў даны час і ў данай арганізацыі будаўнічыя матар'ялы. Так, наводзе нараду, выданага 30-I Белмясгандлю на цэглу, на Магілеў аказалася, што там у гэты час цэглы зусім няма.

У павуціньні найдусаўскага бюракратызму

Ужо пісалася аб шматлікіх нарадах, як асноўным мэтадзе работы гэтай групы. І сапраўды, у справе скліканьня гэтых нарад група прамтавараў набіла ўсе рэкорды бюракратызму. Склікаліся зусім непатрэбныя нарады, адбіраючыя шмат часу ў працаўнікоў іншых арганізацый.

10-XI 29 г. склікаецца нарада, на якой прапануецца ўсім зацікаўленым арганізацыям (Скурсындыкат, Белкаапсаюз і інш.) паведаміць Наркамгандаль аб колькасьці тавараў, якія яны атрымаюць у 1929-30 г. для спэцвопраткі.

30-V 29 г. склікаецца нарада 7 арганізацый для абгаварэньня цярадку збору заявак арганізацый на будаўнічыя матар'ялы, на якой выносіцца вельмі «мудрая» пастанова аб тым, што ВСНГ павінен падаць заяўкі на гэтыя матар'ялы для прамысловага будаўніцтва, Наркамгандаль — для гандлёвага будаўніцтва і г. д.

Ці патрэбна паказваць абсалютную нярэдатнасьць такіх нарад і бюракратычнасьць такіх мэтадаў работы.

Вось яшчэ характэрны прыклад. 18-IV 29 г. БСКА паведаміла Наркамгандлю аб невыкананьні Белсамцрамсаюзам яго (НКГ) пастановы аб водпуску інваліднай каапэрацыі 41 тоны алею. Толькі праз тры тыдні (якія баявыя тэмпы ў рабоце) група прамтавараў паслала наконт гэтага запытаньне БСПС, які 14-V адказаў, што ім дана распараджэньне адной арцелі адпусьціць 5 т. (замест 41 тоны). Здавалася-б, што Наркамгандаль, атрымаўшы гэткі адказ, павінен быў зараз-жа прапанаваць БСПС адпусьціць БСКА рэшту—36 тон алею. Але-ж група прамтавараў, замест гэтага, пасылае 18-V 29 г. яшчэ адно запытаньне БСПС аб тым, як будзе ім выканана пастанова, а 20-V сакае нараду дзеля таго, каб канстатаваць факт невыкананьня БСПС пастановы Наркамгандлю і прапанаваць яму у 7-дзенны тэрмін дагаварыцца з БСКА адносна ўрэгуляваньня гэтага пытаньня. Такіх фактаў ёсьць шмат, але-ж і прыведзеных даволі для вываду аб тым, што гэткая сыстэма работы ёсьць самы горшы від бюракратызму.

І калі гэту сыстэму і практыку работы групы прамтавараў супаставіць з такім фактам, што вельмі важная пастанова аб неабходнасьці ўзмацненьня забесьпячэньня Віцебскай акругі прамтаварамі для мэт загатовак ільну не насылаецца БКС для выкананьня (для скліканьня непатрэбных нарад ёсьць час, а для гэтага часу не знаходзяць), дык будзе зусім яснай сыстэма работы групы прамтавараў, як нікуды нягодная і ўдубальт бюракратычная.

В. АДЛЕРШТЭЙН.

***** І тут абежнік... *****

або як Наркамгандлю кіраваў кантрактацыяй

Кантрактацыя гэтага году аханлие амаль галоўныя віды прадукцыі сельскае гаспадаркі.

Неабходна адзначыць, што ўзаемная увязкі паміж паасобнымі відамі кантрактацыі пры распрацоўцы плянаў у Наркамгандлі ня было. Кожны плян складаўся асобна, бяз увязкі з другімі відамі кантрактацыі.

У асноўным кантрактацыя, як і загатоўкі, кіраваліся «цыркулярным шляхам». У выніку гэтага Наркамгандалю ня здолеў сваячасова сытналізаваць і выправіць тыя ненармальнасьці, якія стварыліся на мясцох з самага пачатку работы на кантрактацыі.

У галіне кантрактацыі прадукцыі жывёлагадоўлі да гэтага часу яшчэ няма патрэбнай яснасьці. Кантрактацыя праводзіцца на дзьвёх лініях — Наркамгандлі і Наркамзему, але работа іх паміж сабою ня ўвязана. На мясцох мы маем такое становішча, калі аванс выдаецца ня ў выніку падліку неабходных затрат на ўтрыманьне кантрактуемай жывёлы, а ў залежнасьці ад таго, па якой лініі гэта кантрактацыя праходзіць. Акрамя таго можа здарыцца такое становішча, калі адно і тое-ж парасё можа быць два разы закантрактавана.

Гэту блытаніну неабходна бязумоўна чым хутчэй зьнішчыць. Рабочая брыгада, якая правярала работу НКГандлю ў галіне кантрактацыі, выкрыла і паасобныя палітычныя памылкі ў дырэктывах.

Так, Наркамгандлю была першапачаткова ўзята няправільная ўстаноўка на забесьпячэньне кулакоў за наяўны разрахунак насеньнем і машынамі па кантрактацыі ільну пасьля задаваленьня беднякоў і сераднякоў. Праўда, потым гэта палітычна нявытрыманая дырэктыва была скасавана.

Вольтаж.

Кансультанты, ці тэхнічныя перапісчыкі

У гэтым артыкуле мы спынімся на тых пытаньнях, з якімі прыходзілася азнаёміцца нашай брыгадзе.

Возьмем, напрыклад, прамтаварную групу, на чале якое знаходзіцца эканамісты — т. **Найдус.** Ня гледзячы на тое, што т. Найдус і зьяўляецца эканамістым гэтае групы, але глыбокая эканамічная работа ў яго групе амаль адсутнічае. Замест сапраўднага рэгуляваньня, на падставе эканамічнага вывучэньня таго ці іншага пытаньня, т. Найдус займаецца папяровай перапіскай, а часта і адпіскай. У выніку такіх адносін т. Найдуса да справы, мы маем наступнае:

1. У галіне рацыяналізацыі тавараразпрасоўваньня, пачынаючы з 1927 г., ніякога ня зроблена.

2. Належнага вывучэньня цэн, накідак і іх рэгуляваньня — няма. З 1927 году цэны ў асноўным нават не пераглядаліся, ня кажучы аб тым, што ніякага кантролю за імі няма.

3. Важнейшая палітычная кампанія па зьніжэньні цэн, якая амаль поўнасьцю датычылася групы т. Найдуса, прайшла амаль без яго ўдзелу.

Матар'ялы праверкі работы т. Найдуса сьведчаць аб тым, што ён ня справіўся з гэтай работай.

Ня мае чым пахваліцца і кансультант па сырцы—т. **Кіізла.** Гаворыць ён многа і ня кепска, але карысьць з яго працы мала. Рацыяналізатарская работа па яго групе, за выключэньнем скурсырцу, зусім няма.

Праведзеная некаторая рацыяналізацыя ў адносінах скурсырцу, прароблена не па ініцыятыве т. Кіізла, а выключна па пастанове вышэйшых органаў.

Нарэшце, нельга ня спыніцца на рабоце т. **Турака.** Пытаньнем папярэньня харчовай базы т. Турак пачаў цікавіцца толькі ў мінулым годзе. Ячнапітушнаму рынку аддавалася таксама мала увагі. У выніку — у БССР маем усяго дзьве птушніцкія гаспадаркі ў той час, калі мінімальная патрэба, па думцы т. Турака, хаця-б 1 гаспадарка на акругу. Роля гэтай групы ў арганізацыі прыгарадных гаспадарак — нязначная.

БРЫГАДЗІР.

ЦЫРКУЛЯР КІРАВАЎ ЗАГАТОЎКАМІ

Перш за ўсё, што кінулася ў вочы рабочай брыгадзе фабрыкі «Кастрычнік», якая правярала работу Наркамгандлю ў галіне загатовак, гэта амаль поўная адсутнасьць жывога кіраўніцтва. На месцы адказныя працаўнікі выяжджалі зусім рэдка. У асноўным кіраўніцтва Наркамгандлю загатоўкамі ажыцьцяўлялася цыркулярамі і перапіскай. Кожны з супрацоўнікаў лічыў сваім абавязкам пісаць і пісаць, чым больш.

Сэнс-жа гэтых цыркуляраў, лістоў і адносін быў зусім трафарэтны—узмацніць работу, узьняць загатоўкі.

Новых-жа, больш рацыянальных мэтадаў Наркамгандаль не паказваў.

Лёзунг партыі аб сацспаборніцтве ня быў падхоплен Наркамгандлем і не скарыстаны, як мэтад, на ўзмацненьні загатовак і палепшэньні якасьці работы загатоўчага апарату.

У галіне плянаваньня загатовак брыгада выявіла неўгрунтаваньне плянаў загатовак другарадных відаў сырцу.

Наркамгандаль зусім не вывучаў і не кантраляваў, як выдаткоўваюцца вылучаныя для загатовак прамтавары, што ва ўмовах дэфіцытнасьці гэтых тавараў зусім недапушчальна.

ГРУПА БРЫГАДЗІРАЎ.

Пляны, адарваныя ад жыцьця

Аб'ядцаньне ўсёй плянавай работы гандлі, распрацоўка перспэктыўных плянаў і кантрольных лічбаў — гэта частка плянавай працы, якую паказаньняў СНК павінен быў праводзіць Наркамгандаль праз свой гандальплян.

На паперы гандаль-плян быў старан. Загадам Наркамгандлю нават быў выдучан для гандальпляну рабочы апарат — плянавая група Наркамгандлю, якая... існавала на паперы, бо складалася з аднаго чалавека, загружанага самымі рознастайнымі заданьнямі, ня меўшымі ніякога дачыненьня да плянаваньня.

Ня дзіва, што гандаль-плянавая камісія, сабраўшыся некалькі раз і «абгледзеўшы» некалькі пытаньняў, толькі чынам, ня плянавала, а зусім арганізацыйнага характару, сьцьвердзіла сваё існаваньне. З лютага месяца гандаль-плян ужо больш ня зьбіраўся.

Выявіўшы такія адносіны да справы плянаваньня, рабочая брыгада на чыгунцы, якая праверыла гэту галіну працы Наркамгандлю, ужо ня была здзіўлена, сустрэўшыся, напрыклад, з такімі зьявішчамі. Пляны загатовак на сырцы і пляны па загатоўцы яго складаліся ў Наркамгандлі на падставе зусім розных даных аб колькасьці вялікароглаўя жывёлы ў БССР. Пляны забесьпячэньня асноўнымі прадуктамі складаліся на падставе розных і нярэдкім амаль што неўгрунтаваных даных аб колькасным складзе сацыяльных груп насельніцтва.

Пляны, складзеныя ў Наркамгандлі, ня ўвязаныя адзін з другім, зразумела, не маглі быць увязаны з магчымасьцямі сельскай гаспадаркі, не грунтаваліся сырцом базы прамысловасьці.

Плян мясазаготовак быў складзены на основе патрэбнасьці» у мясе ці лічбе, г. зн. без разьмеркаваньня паасобных відах мяса: сьвініна, мяса, цяляціны.

Пляны на асобных відах таксама складаліся «на патрэбнасьці». Так, напрыклад, складаліся на другарадных відах. Гэтым тлумачыцца, што загатоўка аказвалася ці значна вышэйшай, ці значна ніжэйшай, чым гэта мерквалася плянам.

Адзінага пляну забесьпячэньня Наркамгандаль зусім не складае. Ня мае пляну забесьпячэньня асноўнымі прамтаварамі.

Плянавая работа Наркамгандлю — узорчык таго, якія кветкі могуць расьці ад рабочых мас, бо грамадзкасьць ніколі ня цягвалася хаця-б да абгаварэньняў, якія выходзілі з нутраў Наркамгандлю.

БРЫГАДЗІР І.

У залежнасьці ад рынкавай стыхіі

Загатоўка такіх каштоўных для рабочага забесьпячэньня прадуктаў, як мёд, кі і штупка, да 1929-30 г. ковы, ня плянавы характар.

Таму рабочае забесьпячэньне прадуктамі было пастаўлена ў залежнасьць ад рынкавай стыхіі. Загатоўчы апарат, маючы малое задаволь, не ведаў рыхтаваўся да максымум рынку і мабілізацыі ўсіх рэсурсаў.

З загатоўкай малочных прадуктаў 1/V пляны на справа ня лепшая. На 7 прац. масьце выканан толькі на 7 прац. Плян зусім неўгрунтаваны—мерквались ні загатоўшчыкаў узяты ні загатоўчых цэн адсутнічала—загатоўчыя, як ведаеш».

Для прэміяваньня здачы мяса была вылучана значная сума моцных кармоў, але каму разданы, як яны выкарыстаны Наркамгандлю ня ведае.

Я.

Па хібах рабочага кантролю над савецкім апаратам

Шэфства заводаў і фабрык над савецкім апаратам у БССР налічвае за сабою каля пасьлядні месяцаў. Пінкрамі ў гэтай справе зьявіліся рабочыя ф-кі «Кастрычнік», якія ў сьнежні 1929 году прынялі шэфства над Наркамгандлем. Замі разгарнулі шэфскую работу рабочыя фабрык і заводаў іншых гарадоў БССР. а сёньняшні дзень, наводзе нестк, якія сьць у НК РСІ, колькасьць такіх прадпрыемстваў складае каля 45 (за выключэньнем Мазыра, Воршы, Полацку, дзе як відаць, яшчэ ніводнае прадпрыемства не прыняло шэфства).

На жаль, мы яшчэ ня можам падсьвіці поўных вынікаў гэтай справы, галоўным чынам, таму, што ў нас зусім слаба ўлічваецца практыка работы і што кіраўніцтва шэфствам таксама зусім нездавальняючае, а месцамі амаль што адсутнічае.

Праўду кажучы, у шэфскай рабоце ёсьць яшчэ значная доля самацёку саматужніцтва, а часамі шэфства трапляе ў рукі бюракратычных чыноўнікаў, якія па-свойму тлумачаць гэту важнейшую палітычную задачу.

Некалькі слоў аб значэньні, задачах шэфства. ЦК і ЦКК УсеКП(б) у сваёй пастанове так сфармулявалі задачу шэфства: «Асноўная задача шэфства заключаецца ў масавым уцягненьні рабочых брыгад у справу дзяржаўнага кіраўніцтва і кантролю зьнізу над савецкім апаратам. Гэта мэта павінна быць кіруючай і асноўнай пры практычным разгортваньні шэфства». Здаецца, усё тут ясна, зразумела.

Між тым, ужо адзначан цэлы рад выпадкаў, калі імкнуцца рабіць іншыя «ўстаноўкі» ў гэтым пытаньні. Так, напрыклад, газэта «Рабочий» у № 281 ад 9-XII 29 г., падаючы інфармацыю аб дрыняцьці шэфства рабочымі фабрыкі «Кастрычнік» над Наркамгандлем, піша аб задачах шэфства, як «о настоятельной необходимости коллективного рабочего руководства советским аппаратом», а Магілеўская АКК-РСІ у красавіку 30 г. (ужо пасьля пастановы ЦК і ЦКК) у сваёй справаздачы аб шэфстве на Магілеўскай акрузе адзначае, што газэта «Камунар Магілеўшчыны» не зрабіла ўсяго патрэбнага для выразнаньня гэтага пытаньня «...маючага палітычную значнасьць у добраахвотным руху рабочай клясы на ажыцьцяўленьні зьнізу сапраўднага рабочага кантролю і непасрэднага кіраўніцтва імі (!) працай савецкага апарту».

«Устаноўка» аб непасрэдным кіраўніцтве з боку рабочых у парадку шэфства працай савецкага апарату, відаць, правільная, практычна шкодна, аб'ектыўна можа быць да густу тым бюракратычным элемэнтам, «апаратчыкам», якія з вялікай ахвотай пераляжыці-б непасрэдную адказнасьць за працу апарату на плечы рабочых брыгад.

У газэце «Савецкая Беларусь» (№ 85 ад 12-IV) Г. Шклоўскі, «бічуючы» недахопы у шэфскай працы, між іншым, правільна адзначыў, што алмоўныя бакі шэфскай работы «зьяўляюцца вынікам недастатковай асьвядомленасьці аб гэтай рабоце некаторымі партыйнымі, савецкімі і прафпрацаўнікамі», але-ж узяў сабе задачу тлумачыць пастанову ЦК і ЦКК па пытаньні шэфства і набытаў сам.

Вось як Г. Шклоўскі «растлумачвае» гэтае пытаньне:

«Значэньне дагавору зьяўляецца ў тым, што адказнасьць за работу ўстановы (!) прымае на сябе шэфствуючы завод у роўнай меры з адміністрацыяй установы. Шэфы выдзяляюць цэхавыя брыгады, адказныя за паасобныя галіны работы...

«Рабочыя заводу быццам зрастаюцца з дзейнасьцю ўстановы. Яны прымаюць удзел у яго апэрацыйнай рабоце, ілсуць адказнасьць разам з установай, над якою яны шэфствуюць, за правядзеньне выразнай клясавай лініі».

Такая пастаноўка пытаньня нічога агульнага ня мае з дырэктывамі партыі аб шэфстве. Трэба раз назаўсёды зразумець, што ня можа быць і гутаркі аб «адказнасьці ў роўнай меры з адміністрацыяй», аб «зрастаньні (?) з дзейнасьцю ўстановы», што справа ідзе аб масавым рабочым кантролі зьнізу над савецкім апаратам і ўцягненьні рабочых у справу дзяржаўнага кіраўніцтва. Ніякай непасрэднай адказнасьці за работу ўстановы рабочыя не нясуць і несьці не павінны; за работу ўстановы па ўсіх пытаньнях адказваюць і павінны адказваць кіраўнікі ўстановы, супрацоўнікі, партыйныя, прафсаюзныя арганізацыі гэтых устаноў.

На жаль, мы ўжо маем прыклады вырашэньня пытаньня паводле Шклоўскага. У Бабруйску акруговы фінансавы аддзел у мэтах самастрахоўкі не праводзіць ніводнага пасяджэньня бяз прысутнасьці рабочых з шэфскіх брыгад і кожны раз патрабуе ад рабочых падпісваць пратакол пасяджэньня. Калі рабочы не зьяўляецца на пасяджэньне, дык бюракраты з фінансавага аддзелу адтэрміноўваюць пасяджэньне, або пасылаюць спэцыяльна кур'ера за рабочымі - шэфамі. Што гэта, як ня самае злоснае бюракратычнае скажэньне ідэі шэфства?

Там-жа ў Бабруйску некаторыя падшэфныя савецкія ўстановы скарыстоўваюць рабочых - шэфаў на розных даручэньнях. Такім чынам, рабочы - шэф ператвараецца ў просты прыдатак бюракрата - чыноўны. У Гомелі таксама ёсьць прыклады, калі рабочых - шэфаў скарыстоўваюць выключна па... кантрактацыі бульбы.

Яшчэ больш «ініцыятывы» праявілі бюракраты з Магілеўскага акрфа. Заключаючы шэфскі дагавор з швейнай фабрыкай, ім удалося ўціснуць у дагавор такі пункт:

«Дагаворваючыяся арганізацыі адказваюць за клясава - чоткую і правільную работу ў галінах сельска - гаспадарчага падатку, прамыслова - прыбытковага падатку, непадатковыя даходы, правільнае і своячасовае складаньне бюджэтаў і яго выпаўненьне, абслугоўваньне насельніцтва апічадными касамі, распаўсюджваньне займаў, правільнае крэдытаваньне прамысловасьці Дзяржбанкам, упрашчэньне і арабачэньне апарату, правільнае і своячасовае рэагаваньне на ўсе скаргі насельніцтва».

Зразумела, што гэты пункт змазвае пытаньні масавага рабочага кантролю зьнізу, што фінработнікі падсунулі рабочым «противоядие» ад кантролю.

У Магілеве такая практыка заключэньня дагавароў, мусіць, у вялікай модзе, бо ў дагаворы паміж рабочымі хлебазаводу і служачымі Магілеўскага аддзяленьня Дзяпрасаюзу таксама ўстаўлен такі пункт, які амаль слова ў слова паўтарае пункт у дагаворы фінаддзельцаў.

Мы ня бедаем, ці дайшлі ўжо магілеўскія ўстановы да такога стану скарыстаньня рабочых шэфаў, як Бабруйскі фінаддзел, але-ж калі не скасуюць самі рабочыя гэткага дагавору, дык дойдуць, бо ўжо пракурор Топаз на нарадзе рабочай брыгады па шэфстве над акрсудом і пракуратурай 16 красавіка г. г. рабочым - шэфам прапанаваў (?) прысутнічаць пры прыёме наведвальнікаў, выступаць у якасьці грамадзкіх абвінавачэньняў і выконваць асобныя даручэньні з боку пракурора па расьсьледваньні спраў. Праўда, рабочыя - шэфы ўнесьлі неабходныя папраўкі ў прапановы пракурора, але гэтыя прапановы характэрны самі па сабе, як яны нытрутваюць пытаньні рабочага кантролю.

Рабочыя бачаць, што іх стараюцца ў апараце прыбраць у бюракратычныя рукі і, не атрымліваючы належнага партыйнага кіраўніцтва, часамі кідаюць сваю шэфскую работу ў брыгадзе. Тады бюракраты ня спыняюцца ні перад чым. Вось, напрыклад, да чаго дайшоў Бабруйскі акрсуд. Даем слова старшыні суду:

«Копія.

Фабзаўмясцкому лесазаводу № 6.
Гарэлачнаму заводу і абутнікаў.
Копія РСІ.

У апошні час брыгадзіры па шэфству над Акрсудом і Нарсудом амаль што не зьяўляюцца, а калі і зьяўляюцца, дык ня больш 3-5 асоб і то з вялікім спазьненьнем, чаму праца па шэфству зрываецца.

Акрсуд просіць прыняць меры, каб усе брыгадзіры прымалі ўдзел па шэфству і своячасова зьяўляліся на працу.

Старшыня Акрсуду (подпіс),
Сакратар (подпіс)».

Дык вось да чаго даходзяць людзі, якія замест таго, каб прыняць належныя меры па паляпшэньні справы, пайсьці туды, на завод, да рабочых і разам з грамадзкімі арганізацыямі растлумачыць канкрэтныя задачы шэфства, ужыць захады па стварэньні неабходных умоў працы шэфскім брыгадам у сябе ва ўстанове, займаюцца бюракратычнымі адпіскамі, запискамі і думаюць, што яны гэтым усё зрабілі для вырашэньня дырэктывы партыі.

Бабруйскі акрсуд зойме, мусіць, першае месца ў Беларусі па фармальна-бюракратычных адносінах да рабочых шэфаў.

У радзе выпадкаў у дагаварах па шэфстве запісваюцца пункты, якія нічога агульнага ня маюць з пытаньнямі шэфства і якія ўскладаюць на абодвы бакі ўзаемныя абавязацельствы. Напрыклад, у дагаворы рабочых - чыгуначнікаў з Белкаапсаюзам ёсьць пункты, дзе гаворыцца аб тым, што рабочыя - чыгуначнікі і супрацоўнікі БКС абавязваюцца «...да 31-га красавіка 1930 г. каапэраваццца на 100 проц. і да гэтага-ж тэрміну пагасіць поўнасьцю запазычанасьць па дыфпаі», і далей «...добраахвотна павялічыць свой каапэрацыйны пай да разьмеру месячнага акладу і пагасіць на працягу ўстаноўленага тэрміну».

Нярэдка пападаюцца ў дагаворах абавязацельствы рабочых прадпрыемства перад служачымі савецкага апарату прыкладна такога зьместу: «зьяўляць прагулы і спазьненьні бяз уважлівых прычын, скараціць брак, папяжіць сабекошт, падняць прадукцыйнасьць працы», або «забясьпечыць здабыцьцё кваліфікацыі (у межах 3-х апэрацый) пасылаемым на фабрыку працаўніком акрфа» (Магілеў). Зусім відавочна, што такія пункты ў дагаворах пераключаюць справу шэфства на рэйкі сацыялістычнага спаборніцтва паміж прадпрыемствам і ўстановай, прычым пытаньні масавага рабочага кантролю зьнізу над савецкім апаратам падмяняюцца кантролем з боку служачых над работай прадпрыемства.

У дагаворы паміж рабочымі - чыгуначнікамі і БКС так і запісана, што «выкананьне работ і ўзятых на сябе абавязкаў па гэтым дагаворы абодвы бакі праводзяць у парадку сацыялістычнага спаборніцтва».

Зразумела, што такія пункты ў дагаварох замазваюць, затушоўваюць асноўную задачу шэфства — уцягненьне рабочых у справу дзяржаўнага кіраўніцтва і масавы рабочы кантроль зьнізу над савецкім апаратам. **Нельга рабіць упор на сацыялістычнае спаборніцтва, бо справа ідзе не аб спаборніцтве, а аб масавым рабочым кантролі над савецкімі ўстановамі.**

Месцамі даходзяць да таго, што адкрыта ставіцца пытаньне аб кантролі савецкай установы над прадпрыемствам, г. зн. служачых над рабочымі.

Напрыклад, нехта Донін у газэце «Камуніст» (№ 150) у артыкуле «Як наладзіць працу на шэфстве» ў ліку іншых мерапрыемстваў раіць, каб «у калектыве акрфа адзін раз у год ставіць даклад ад дзейнасьці шэфскіх вытворчых арганізацый».

Мы павін

Трывожныя факты

Павялічэньне прагулаў на прадпрыемствах у красавіку

Як ужо адзначалася ў папым друку, красавік месяц даў павялічэньне прагулаў. Канчатковыя лічбы за красавік мецы пакажуць гэтае зьяўленьне. Усяго году — прагулы павялічыліся ў параўнаньні нават з мінулым годам. У той час, як за красавік 1929 г. лічбы прагулаў па ўсёй рэспубліканскай прамысловасьці складалі 0,45 проц., красавік г. г. даў лічбу прагулаў у 0,54 проц.

Павялічэньне прагулаў адзначаецца ямаль на ўсіх галінах прамысловасьці. На **шкляной** прамысловасьці павялічэньне прагулаў ідзе за лік заводу **«Пралетары»**, які ў красавіку даў рэкордную лічбу прагулаў—0,92 проц.; завод **«Кастрычнік»**—з 0,13 проц. у сакавіку дае ў красавіку павялічэньне прагулаў да 0,59 проц.; гута **«Ноўкі»** з 0,01 проц. у сакавіку—да 0,29 проц. у красавіку; гута **«Працы»**—з 0,75 проц. да 1,05 проц.

Менская таксама з працыцыплінай у **мотаўёвай** прамысловасьці. Прычым дасьлядзім значнае павялічэньне прагулаў паказваюць завод **«Чырвоны Адраджэнец»** у Магілеве, які ў красавіку месяц паказаў лічбу прагулаў да 1,73 проц.; завод **«Энэргія»**—1,63 проц.; завод **«Інтэрнацыянал»**—1,02 проц. і завод **«Комінтэрн»** у Віцебску—1,27 проц.

Горш прагулаў дае таксама і **тэкстыльная** прамысловасьць. Так, ф-ка **«Дзьвіна»** лічбу прагулаў у сакавіку месяца ў 0,40 проц. у красавіку павялічыла прагулы да 0,67 проц.

Узрослі таксама прагулы на менскай **гапантэрэйнай** фабрыцы—з 0,24 да 0,40 проц. у красавіку.

На **швэйнай** прамысловасьці ўзрост прагулаў дае **футравая фабрыка «1-га мая»**, якая лічбу прагулаў у 0,27 проц. у сакавіку павялічае да 0,46 проц. у красавіку. Адначасова зварачае на сябе увагу значнае павялічэньне прагулаў на **бабруйскай швэйнай фабрыцы**—1,11 проц. Вызначылася і **панчошна-трыкатажная** фабрыка, якая у красавіку ў два разы павялічыла лічбу прагулаў (0,17 проц.—0,34 проц.).

Узрост прагулаў дае таксама **абутковa-гарбарная** прамысловасьць—з 0,27 проц. да 0,36 проц. На асобных прадпрыемствах прагулы павялічыліся на заводах: **«Бальшавік»** з 0,35 проц. у сакавіку да 0,45 проц. у красавіку; **Віцебскай абутковай** фабрыцы—з 0,37 проц. да 0,49 проц.; **Гомельскай абутковай** фабрыцы—з 0,05 проц. да 0,43 проц..

Павялічэньне ёсьць і па запалкавай прамысловасьці: на «Чырвонай Бярозіне»—з 0,20 проц. да 0,72 проц.; «Х-ы Кастрычнік»—з 0,39 проц. да 0,52 проц. Зварачае на сябе ўвагу павялічэньне прагулаў на «Пралетарскай Перамозе»—0,73 проц.

Значна ўзрастаюць прагулы і на прадпрыемствах **дрэваапрацоўчай** прамысловасьці—0,43 проц. у сакавіку і 0,92 проц. у красавіку. Прычым асобныя прадпрыемствы паказваюць зусім ганебныя лічбы: **Бабруйскі лесакамбінат** павялічае прагулы ў красавіку з 0,30 проц. да 1 проц.; **«Дрэваапрацоўшчык»**—з 0,16 проц. да 0,56 проц., **«Спартак»**—з 0,04 проц. да 1,03 проц.

Папяровая прамысловасьць наогул паказвае памяншэньне прагулаў, але асобныя прадпрыемствы ўсё-ж даюць павялічэньне. Так, фабрыка **«Прафінтэрн»** дае павялічэньне з 0,38 проц. у сакавіку да 1,61 проц. у красавіку.

Павялічэньне прагулаў у красавіку нават супроць красавіка мінулага году зьяўляецца вельмі трывожным фактам, які павінен прыцягнуць да сябе ўвагу ўсёй рабочай грамадзкасьці.

Трэба памятаць, што прагулы зьяўляюцца адным з галоўнейшых відаў страт у прамысловасьці, з якімі трэба павесьці рашучую барацьбу.

А.

Чыстка работнікаў сталовак і буфэтаў бяз удзелу мас

Адна з важнейшых задач у сучасны момант — гэта паляпшэньне грамадзкага харчаваньня. Гэтае пытаньне зьвязана з узвышшэньнем рэальнай зарплаты і выкананьнем прамфінплану.

Але, калі прыведзецца да работы сталовак і буфэтаў, дык мы ўбачым такія лідзіцьці, як выдача пасаваных прадуктаў, павышэньне цэн, недаважаньне. Гэта ўсё трэ' было выявіць у часе чысткі работнікаў сталовак і буфэтаў. Але фактычна гэтага не удасца зрабіць з прычыны слабога ўдзелу рабочых у чыстцы.

На чыстцы сталоўкі № 44 і буфэту тарбарні, ня гледзячы на частыя напаміны камісіі, ніхто з рабочых на чыстку не зьявіўся. Такое-ж зьявішча мы бачылі на заводзе «Дрэваапрацоўшчык», ня гледзячы на тое, што пранеркок у дзень чыстки быў на заводзе і канстатаваў многа непармальных зьяў. Зноў на чыстку сталоўкі № 5. Зноў на чыстку ніхто з рабочых не зьявіўся, і таму чыстка была сарвана.

Такое-ж зьявішча было з буфэтамі. Так, напрыклад, у буфэце пры 20-й школе на Ляхаўцы ёсьць таксама шмат злоўжываньняў: пры выдачы 50 грам сыру было выяўлена 15 грам недаважаньня. Былі выпадкі недадачы рэшты. Падагачыні савет быў сваячасова паведамлен аб надыходзячай чыстцы, але ніхто не зьявіўся.

Зараз камісія на чыстцы будзе правяраць больш 70 буфэтаў, раскіданых на ўсім горадзе, у якіх ёсьць шмат брыдкіх зьяў, як растраты, недаважаньне, перавышэньне цэн і самае горшае—продаж дрэннай якасьці прадуктаў. Адна камісія ня ў стане ўсё гэта выявіць і таму каапкамісіі таксама, як і фабзаўкомы, павінны ў абавязковым парадку прыняць удзел у чыстцы іх буфэтаў і сталовак для зьнішчэньня ўсіх гэтых брыдот.

І. ФУКС.

Юбілей ударнага эскадрона

Асобны эскадрон № 1-га кавалер. корпусу свайго існаваньня. Эскадрон сфармаваны у 1925 годзе. Эскадрон сфармаваўся ў мірных умовах і на мае за сабой багатую мінулага. Але асноўны касьцяк начскладу — удзельнікі грамадзянскай вайны, якія маюць багаты практыку і выхоўваюць байцоў эскадрона мінулым, у духу самаадданасьці справе пралетарскай рэвалюцыі. Да свайго пяцігадовага існаваньня эскадрон мае на асабістага выхаваньня высокую, баявую дысцыпліну і выключна зьдзяйляецца ударным. Камандзір эскадрона ўсім дзеянням пасвой гадрых баяў результату шпрыцтва.

Курсанты шкоды на прыёме «Марсу» даюць, наводзе плянку пакалася дань 40 Тэлеграфісты дагавору павінны касьці 80 знак тага.

Тэлефаністы пракладку кабэльна-тэлефоннай лініі давялі да 4-5 клм. у гадзіну, што зьяўляецца перавышэньнем норм паводле статуту. Аддзяленьне 1-га разьдзелу заслугоўвае быць адзначаным асобна, як паказаўшае бліскучыя дасягненьні.

Дзякуючы энэргічнаму праяўленьню ініцыятывы, аддзяленьне, над кіраўніцтвам ячэйкі, першае вырасла ва ударнае і мае больш посьпехаў, чым іншыя. Аддзяленьне дабілася начное пракладкі кабэльна-тэлефоннай лініі на 8 клм. у 1 г. 15 м. і гэта пасьля 44 клм. дняўнога маршу. Цяпер перад начскладам і байцамі стаіць чарговая задача падцягваць адсталых, выраўноўваць іх па перших і з падвойнай энэргіяй узяцца за далейшае ўдасканаленьне баявой і палітычнай вучобы.

Байцы добра разумеюць свае клясавыя задачы і ўяўляюць сабе, што на кожным з іх ляжыць частка адказнасьці за абарону краіны і ў дзень пяцігодкі рапартуюць, што партыя і рабочая кляса ў асобе эскадрону сувязі маюць аддаццю і цьвёрдую апору пралетарскіх заваяваньняў.

І. АЛЕЙЧЫК.

На сямігадзінны рабочы дзень

Урадавая камісія СНК БССР пастанавіла перавесьці на сямігадзінны рабочы дзень наступныя прадпрыемствы: маспаробчыя заводы — «Зорка» ў Магілеве, імя Калініна ў Віцебску і імя Адзярыхі ў Бабруйску — 1-га чэрвеня, Віцебскую ігорную ф-ку і Менскі завод «Энэргію» — з 11-га ліпеня, Дабруйскую папяровую ф-ку «Гэрой Працы», шпалерную ф-ку імя Вароўскага ў Менску, Гомельскую друкарню «Палесдрук» і друкарню БДВ у Менску — з 1-га жніўня, кафляна-плітачны завод у Копысі — з 1-га верасьня.

Першая усебеларуская

На здымку — фабрыка-школа Меншвэю — практычныя заняткі

Першая ўсебеларуская фабрыка-школа швэйнікаў пачала працаваць у Менску з 1 мая.

250 маладых вучняў—будучых кваліфікаваных рабочых і майстроў сёньня яшчэ няпоўнагадовых, ва ўзросьце 16-17 год, вучацца працаваць, рыхтуюцца стаць швэйнікамі.

150 з іх узяты з біржы працы, 100 з дзіцячых дамоў.

Па сацыяльным складзе—98 проц. дзяцей рабочых і толькі 2 проц.—служачых і саматужнікаў.

Разам з навучаньнем швэйнай вытворчасьці вучні фабрыкі-школы вывучаюць беларускую мову, матэматыку, грамадазнаўства і інш. прадметы і па сканчэньні школы будуць мець асьвету за сямігодку.

8-гадзінны рабочы дзень вучняў разьбіваецца на дзьве часткі: 4 гадзіны вывучаюць агульна-асьветныя навукі, 4 гадзіны працуюць у цэхах. Сьветлыя і чыстыя цэхі абсталяваны паводле апошняга слова тэхнікі. Усе машыны працуюць на мэханічных рухавіках пры самай максымальнай рацыяналізацыі працы.

І дрэнна толькі тое, што з 100 вучняў-выхаванцаў дзіцячых дамоў усяго 66 жывуць у інтэрнатах, а іншыя — усё яшчэ ў дзіцячых дамах.

У школе моладзь праходзіць усе стадыі працы, знаёміцца і вывучае ўсе працэсы швэйнай прамысловасьці.

Ужо нападжваецца грамадзкая і палітыка-выхаваўчая работа: арганізавалася камсамольская ячэйка з 40 чал., арганізуюцца гурткі фізкультуры, драматычны і інш.

Першая ўсебеларуская фабрыка-школа рыхтуе сьвядомых і кваліфікаваных пралетараў-швэйнікаў—будучых барацьбітоў за сацыялізм.

А. М—аў.

Хроніка

ШТАБ ПА БАРАЦЬБЕ СА СТРАТАМІ

При Дзяржпляне БССР утворан штаб па барацьбе са стратамі ў складзе т. т. **Каплана, Шэйніна і Васілеўскага.** Штаб мяркуе прыцягнуць да сваёй работы друк, прафсаюзныя і грамадзкія арганізацыі.

ЗООАТЭХНІЧНЫ ІНСТЫТУТ У БЕЛАРУСІ

Прэзыдыум Дзяржпляну БССР прызнаў неабходным арганізаваць з 1-га кастрычніка ў Горках самастойны зоатэхнічны інстытут замест існуючага факультэту жывёлагадоўлі пры беларускай с.-г. акадэміі. Інстытут будзе падпарадкаваны Наркамзему.

РАСТЛУМАЧЭНЬНЕ НАРКАМЗЕМУ І БЕЛКАЛГАСЦЭНТРУ

Наркамзем і Калгасцэнтр БССР растлумачваюць, што пункт 4 прыкладнага статуту с.-г. арцелі, які прадугледжвае пакінуць у індывідуальным карыстаньні калгасьнікаў па 1 карове, пашыраецца і на прылад ад гэтых кароў. Гэта значыць, што ад неабагуленых кароў пяляты застаюцца ў карыстаньні калгасьнікаў.

УРАЧЫСТАЕ АДКРЫЦЬЦЁ ЛЯГЕРАЎ

5-10 чэрвеня ў прысутнасьці дэлегацый рабочых, калгасьнікаў, сялян адбудзецца ўрачыстае адкрыцьцё летніх лягераў кавалерыйскай дывізіі імя антольскага пралетарыяту.

Да адкрыцьця лягераў на працягу 2-х дзён будуць адбывацца дывізійныя конна-спартыўныя спаборніцтвы.

СУРОВАЯ ВЫМОВА БЕЛМАЛЖЫВСАЮЗУ

Наркамгандаль БССР абвясьціў праўленьню Белмалжывсаюзу суровую вымову за нядбайныя адносіны да ўліку мясных апэрацый. Дадзена папярэджаньне Белмалжывсаюзу, а таксама і Белкаапсаюзу аб тым, што за непрадстаўленьне Белмясу вестак па мясных апэрацыях яны будуць працягнуты да судовай адказнасьці.

ПЭНСІЯ ІНВАЛІДАМ ВАЙНЫ

Дзяржпляннам устаноўлены на 1930-31 год стаўкі месячнай пэнсіі інвалідам вайны ў акруговых гарадох ад 15 да 30 руб. і інш. мясцовасьцях ад 12 да 24 руб. За інвалідамі вайны захоўваюцца сяменныя надбаўкі ў разьмеры мінулага году. Сем'ям забітых на вайне будзе выдавацца пэнсія ў акруговых гарадох з 10 да 21 руб. і ў іншых мясцовасьцях —з 7 да 17 руб.

Для сем'яў чырвонаармейцаў і найсовага пераменнага складу тэрытарыяльных часьцей стаўкі пэнсіі на 1930-31 г. для ўсіх мясцовасьцяй БССР устаноўлены ад 6 да 10 руб. у месяц.

Пастанова перадаецца на зацьвярджэньне ў СНК.

НОВЫ ДЭКАН ФАКУЛЬТЭТУ САВЕЦКАГА БУДАЎНІЦТВА

У сувязі з пераходам тав. **Канапліна** на работу ў Беларускую Акадэмію Навук, дэканам факультэту савецкага будаўніцтва і права БДУ назначан тав. **Ракаў**, які дагэтуль быў членам калегіі НК РСІ.

МЕСТАЧКОВУЮ МОЛАДЗЬ—НА КУРСЫ БУДАЎНІКОЎ

Камэтэт БССР дана 1.200 месц у будаўнічых цэхах пры цэнтральным інстытуце працы ў Менску. Месцы разьмяркоўваюцца па ўсіх округах. На курсы будзе накіроўвацца яўрэйская бядняцкая моладзь мястачак. Курсанты будуць атрымліваць стыпэндыю ў разьмеры 20 руб.

НОВАЯ ПСЫХІЯТРЫЧНАЯ БОЛЬНІЦА

Зацьверджаны праект пабудовы ў Магілеве 3-х новых двухпавярховых карпусоў псіхіятрычнай больніцы на 340 ложак, з якіх 40 ложак для псыхічна хворых дзяцей. Агульны кошт будаўніцтва—795.000 руб. Пабудова двух павільёнаў павінна быць скончана ў 1930-31 г., а трэцяга павільёну—у 1931-32 годзе.

КІНОФІКАЦЫЯ БССР

СНК зацьвердзіў праект кінофікацыі БССР на 1929-30 г. Плянам прадугледжваецца пашырэньне сеткі кінопрасовак на 127 адзінак. Усяго на БССР будуць курсаваць 288 кіно-перасовак.

РАБОЧЫХ—НА АДКАЗНУЮ РАБОТУ У КААПЭРАЦЫЮ

З ліку рабочых-выдучэнцаў, скончыўшых курсы пры ЦК КП(б)Б, у апарат Белкаапсаюзу ўліта 10 чалавек. Рабочыя назначаны на пасады інструктароў і намесьнікаў загадчыкаў аддзеламі Белкаапсаюзу.

НОВЫЯ ПРАФТЭХШКОЛЫ

Паводле пастановы калегіі Наркамасьветы БССР, 14 навучальна-практыкаваных майстэрань з новага навучальнага году рэарганізуецца ў прафтэхшколы паніжанага тыпу.

КІНО Ў ДНІ 10-ГОДЗЬДЗЯ ВЫЗВАЛЕНЬНЯ БЕЛАРУСІ АД БЕЛАПАЛЯКАЎ

Да 10-годзьдзя вызваленьня Беларусі ад белапалякаў Беддзяржкіно выпускае наступныя кіно-фільмы: культур-фільм, прысьвечаны 11 ліпеня, дакумантальны фільм «Лепшы калгас» і фільм «Падымайся, Беларусь» аб калектывізацыі сельскай гаспадаркі.

11 ліпеня адбудзецца закладка новых кіно-тэатраў у Воршы, у Менску, Гомелі, Віцебску, Магілеве і Бабруйску на пляцох будуць пастаўлены экраны для дэманстрацыі рэвалюцыйных фільмаў.

Няма кіраўніцтва рыбацкімі арцелямі

Стварыць нармальныя умовы працы

Паводле пастановы Экана, усе рыбацкія арцелі, якія да гэтага часу знаходзіліся ў сыстэме сельска-гаспадарчай і паляўнічай каапэрацыі, перададзены пад загад саматужна-прамысловай каапэрацыі. Паводле дагавору паміж Белрыбай і сампрамсаюзам, апошні павінен выдаваць у вадазборах Беларусі да 1-га студзеня 1930 г. 30.000 цэнтнэраў рыбы для рабочай каапэрацыі. На 15 мая па Беларусі Белсампрамсаюз прыняў 99 рыбацкіх брыгад пры калгасах і камунах з 1.615 рыбакамі.

Большасьць арцеляй дрэнна забясьпечана рыбацкімі прыладамі, таму ня можа выканаць заданьня па ўлове рыбы ў тэрмін. Да 15-га мая гадовы плян па ўлове рыбы ў округах выкананы толькі на 16 проц. Ёсьць шмат арцеляй, якія амаль зусім не распачалі сваё працы.

Шмат перашкаджае працы і тое, што Белрыба плаціла рыбацкім арцелям за здаваную рыбу да паловы мая па адных стаўках, а зараз па некаторых округах гэтыя стаўкі зьніжаны і гэта ня гледзячы на тое, што ў дагаварох ясна сказана, што плата за рыбу рыбацкім арцелям ні ў якім разе не павінна быць зьніжана ў параўнаньні з мінулым годам.

Па заяўках Белрыбы для забясьпячэньня рыбакоў па склад Белсампрамсаюзу паступілі з Віцебску сецэматар'ялы. Цана на іх ня вызначана. Рыбакі ня хочуць браць гэтыя рыбацкія прылады, баючыся, што яны будуць надта дорага каштаваць.

У зьвязку з усімі гэтымі ненармальнасьцямі шмат якія рыбацкія арцелі ўжо разваліліся. Трэба паленьніць кіраўніцтва рыбацкімі арцелямі з боку Белсампрамсаюзу, трэба забясьпечыць іх патрэбнаю снасьцю і такім чынам стварыць належныя ўмовы для нармальнае працы рыбацкіх арцеляй. Толькі пры такіх умовах можна спадзявацца, што гадавое заданьне па ўлове рыбы ў БССР будзе выканана.

А.

Рабкоры пішуць

Дзе дрэнна з будаўніцтвам

АДНЫ ГУТАРКІ

Да гэтага часу **Слуцкі** гарсавет не атрымаў ніякага будаўнічага матар'ялу, ня гледзячы на тое, што заяўка сваячасова зроблена на будаўнічы матар'ял. Акрамя таго паслана каля пяці напаміны. Урэшце, сам старшыня гарсавету езьдзіў у Менск і Бабруйск, дзе яму абяцалі выслаць патрэбныя матар'ялы, але апошніх і па сёньняшні дзень няма.

Аб пабудове школы на Востраве гаворыцца на працягу трох год. Ужо надыходзіць чэрвень месяц, а школа ўсё ня будуецца і няма лесаматар'ялу. РВК таксама не клапоціцца аб забясьпячэньні лесаматар'ялам будаўніцтва.

Неабходна высьвятліць хто вінават у зрыве будаўніцтва.

Сечка.

«НЯМА ДУРНЫХ»

Пры **цэнтральнай** бульбяной станцыі адчуваецца вялікі жыльлёвы крызіс. У адным кватэры жыве на дзьве сям'і. Сям'я з 6 чалавек рабочага **Козіча** жыве пад адкрытым небам, бо кватэра, якая належала яму, займае **Нядбальскі**, працаўнік Белпаляводсаюзу. Нядбальскі ніякай сувязі з саўгаскай гаспадаркай ня мае і на месу, бо фактычна ён працаваў прафпрацаўніком ад саюзу сельгасрабочых.

Адміністрацыя зьвярнулася да т. Нядбальскага, каб апошні пакінуў кватэру, але ня так думаў Нядбальскі, ён адказаў: «Няма дурных, я вылучэнец і маю права займаць кватэру 3 гады і мне ніхто нічога ня зробіць, а акрэмя гэтага мне патрэбна дача».

Па гэтай справе т. Нядбальскі адмовіўся прыйсьці на пасяджэньне партячэйкі.

Хто вырашыць гэтае пытаньне.

А. С.

МАТАР'ЯЛ ГНІЕ, А ШКОЛЫ НЯМА

Будаўнічы сэзон даўно ўжо пачаўся, але загадчык **Ракцянскай** школы (Горацкі раён) **Сяменаў Л.** аб гэтым і ня думае. Тры гады ўжо стаіць школа недабудаванай, а сродкі самаабкладаньня марнуюцца ў сельсавеце. Матар'ял да школы амаль увесь падрыхтаваны, але ляжыць пад адкрытым небам і гніе ўжо другі год. Наогул з боку заг. школы праўдзіцца поўная безгаспадарчасьць. Дровы каля школы таксама яшчэ не нарэзаны.

Хто-б яго прабудзіў.

Шкадуючы.

Праца камісіі па вывучэньні Зах. Беларусі

На адным з апошніх пасяджэньняў прэзыдыуму Беларускай Акадэміі Навук быў заслуханы справаздачны даклад камісіі па вывучэньні Заходняе Беларусі за апошні год. За гэты час камісія разгарнула сваю працу даволі шырока.

Складзены альфабэтны і сыстэматычны карткавы рэгістрацыйны каталёг на матар'ялы, працы і кнігі, якія знаходзяцца ў бібліятэках і розных установах гор. Менску і якія датычаць Заходняе Беларусі. Каталёг зьмяшчае ў сабе ўжо каля 6.000 назоваў. Пачата камплектаваньне ўласнай габінэцкай бібліятэкі, якая ўжо ў сучасны момант налічвае звыш 600 назоваў кніжак, часопісяй і камплектаў газэт.

Пачата зьбіраньне дакумэнтаў і матар'ялаў, характарызуючых сучаснае палітычнае становішча Заходняе Беларусі.

Падрыхтаваны і ў бліжэйшым часе здаецца ў друк 11-гі том прац камісіі, у якім будуць зьмешчаны працы з галіны прыродазнаўчага цыклю: а) «Клімат Заходняе Беларусі» — праф. **Кайгародава**, б) «Геамарфалёгічны нарыс Заходняе Беларусі» — вуч. спэц. **Азбукіна**, в) «Фаўна Заходняе Беларусі» — праф. **Фядзюшына.** Падрыхтоўваюцца і ў хуткім часе павінны быць здадзены камісіі працы тав. **Савіцкага** — «Таварыства Беларускае Школы», тав. **Стапевіча** — «Аграрная палітыка фашызму», **т. Пракулевіча** — «Бібліяграфія па прыродзе Заходняе Беларусі».

Камісія прыступіла да выданьня квартальнага бюлетэню аб Заходняй Беларусі, які мае наступныя разьдзелы: а) палітычны, б) эканамічны, якія носяць характар падаваньня фактаў з бягучага жыцьця Заходняе Беларусі і зьмяшчэньня дакумэнтаў з галіны палітыкі, эканомікі і культуры сучаснай Заходняй Беларусі, в) навуковы аддзел, дзе зьмяшчаюцца працы аб Заходняе Беларусі, якія носяць характар навуковага апрацаваньня маючыхся ў распараджэньні камісіі фактычных дадзеных аб сучасным (за апошнае дзесяцігодзьдзе) палітычным, эканамічным і культурным жыцьці Заходняе Бела сі.

ПАВЕДАМЛЕНЬНІ

АД ФРУНЗАЎСКАГА РК КП(б)Б

Кіраўнікамі гурткоў па прапарацоўцы пастаноў XIII зьезду КП(б)Б і XVI зьезду ЎсеКП(б) па Фрунзаўскім раёне вылучаны наступныя т. т.:

Ад **СНК:** Лодысеў—да яч. хлебазаводу, Фрыдман—зав. «Камунар», Спэктар—каап. прадп., харчавікоў; **ЦВК:** Мурашкевіч—стал. МЦРК, Хацкевіч—Гандальбуд; **БАН:** Бандарэнка—стал. МЦРК, Казак—Белдзяржбуд; **ЦСПСБ:** Клімковіч—зав. «Беларусь», Марынгоф—Гандальбуд; **курсы прапагандыстых:** Эрэнбург—ф-ка «Беларуская», Эделнаў—ф-ка «Беларуская», Шварц і Ракіна—ф-ка «Кастрычнік», Герасімчук—зав. «Пралетары», Шапкоў і Шуб—зав. «Дрэваапрацоўшчык», Хацкевіч і Марцынкевіч—Белдзяржбуд, Кульбакоў і Зунейшан—зав. «Камунар», Матлін, Райніцкі і Шыф—Гандальбуд, Краўец—1-я друкарня, Бальзоўскі—міліцыя, Брэгман—футравая ф-ка; **НКА:** Панаў—саўгас «Вольная Праца», Зарэмскі — Белжылсаюз, Чорнабродаў — ф-ка «Кастрычнік»; **Эльвод:** Рак і Сальнікаў — Эльвод; **ВСНГ:** Ізакаў—стал. МЦРК, Панкоў—футравая ф-ка; **ЦК КП(б)Б:** Рагазінкава—1-я друкарня, Капакоцін—ф-ка «Камунарка», Гофман—аддз. хлебазаводу, Гурэвіч—Рымарская ф-ка; **акрінспэктарыят асьветы:** Ярмакоў—хлебазавод, Парук—саюз будаўнікоў; **АК КП(б)Б:** Альшэўская—ф-ка «Чырвоны Тэкстыльшчык», Бірг—1-я друкарня, Гаралік—завод «Дрэваапрацоўшчык»; Драбінскі (ЦП мэталістых) — завод «Камунар», Стрэльле (ЦСУ)—стал. МЦРК, Шчупак (шпалерная ф-ка)—шпалерн. ф-ка, Коф-ман (управ. папертрэсту) — шпалер. фабрыка, Капар (завод «Беларусь»—завод «Беларусь», Сандлер (Белдзяржстрах) — Белдзяржбуд, Белашэўскі (Камвуз)—Белдзяржбуд, Грабузаў (Лесбел) — Гандальбуд, Давідовіч (Наркампрацы) — ф-ка «Кастрычнік», Вайнбэрг (яч. «Камунарка»)—ф-ка «Камунарка», Воск (Дом Камасьветы)—ф-ка «Камунарка», Лазінскі (Белхарчтрэст)—каап. прад. харчавікоў, Каган (ф-ка «Чырвоны Тэкстыльшчык»—ф-ка «Чырвоны Тэкстыльшчык», Левітэ (рэд. «Акцябр»)—друкарня АВК, Калмык, (ЦК МОПР'у—н.-к. абутнікаў, Гэльфанд (палітэхнікум)—саюз будаўнікоў, Чарнушэвіч (Наркамгандаль) — пажар. камандз, Шмушковіч (Белжылсаюз)—БЖС, Сьмірноў (саюз палаўнічых)—Аўтакіраўніцтва, Нікіцін (абкамтрэст)—абкамтрэст, Бэлян (АВК) — яч. прымгарад. с.-с., Баіська (Наркамзем) — саўгас Лекерта, Вайпахоўскі (Акрфа)—«Чырвоны Транспартнік і Ўлезла (бульбяная станцыя) — бульб. станцыя.

Усе гэтыя таварышы павінны ў тэрміновым парадку дагаварыцца з тымі ячэйкамі, да якіх яны прымацаваны, і прыняць практычны ўдзел у арганізацыі гурткоў.

Культпроп Фрунз. РК КП(б)Б паведамляе, што дакладчыкамі на прапарацоўцы матар'ялаў 3-й райпартканфэрэнцыі і 8 акруговай партканфэрэнцыі зацьверджаны т. т., якія вылучаны для прапарацоўкі тэзісаў. Прапрацоўка павінна адбывацца на адкрытых сходах яч. КП(б)Б з прыцягненьнем на іх членаў камсамолу. Ад дні і часе сходу яч. дагаварыцца з вылуч. дакладчыкамі.

АД МЕНСКАЙ АКК КП(б)Б

АКК КП(б)Б просіць зьявіцца на пасяджэньне парттройкі 9 чэрвеня ў 18 г. у АКК (Энгельса, 28) наступных т. т.:

Пятроўская Я. Я.—Уэўдзеньскі р-п, Шорнікава В. Н.—Барысаўскі р-п, Іваш-кевіча М. А., Кіселёву Г. Т. і Зубовіч В. Я.—Бягомльскі р-п, Сазонава В. С.—Астр.-Гар. р-п, Бірыла С. Г. і Кісель М. К. — Пухавіцкі р-п, Трактэнборга М. А.—Чэрвеньск. р-п, Кульгавага і Пачкоўскага В.—Халопеніц. р-п, Дашкевіча—яч. Мен. шофэр. курсаў.

СЁНЬНЯ

ЖАКТ № 13 (Пралетарская, 11). Фракцыя ЖАКТу ў памяшканьні сталоўкі ЖАКТу № 13. Пач. у 19 гадз.

ЖАКТ № 3 (Энгельса, 6). Нарада камуністых жыхароў ЖАКТу № 3 у 19 г.

Аб'яднанае пасядж. сэкцый фізіётэрапэўтычнай і дзіцячых дактароў у нэрвовай клініцы ў 20 г. 30 м.

Д-р **Б. Цыпкін**—Арганізацыя мер барацьбы са скрыўленьнем названочніка ў дзіцячым узросьце. Запраш. педагогі і фізкультурнікі.

Пры БелМБІТ (Дом Працы, 2-гі паверх, пакой № 2) арганізавана бюро садзейнічаньня курсам завочнага навучаньня. Кансультацыі для асоб, якія цікавяцца гэтым пытаньнем, і курсантаў КЗТН праводзяцца членамі бюро 5, 10, 15, 20, 25 і 30 кожнага месяца ад 18-20 гадз.

Ад камісіі па чыстцы Наркамгандлю. Працяг пэрсанальнай чысткі супрацоўнікаў Наркамгандлю адбудзецца 31 мая ў 19 гадз. (памяш. Дзяржгандлю, Пляц Волі, 7). Чыстку будуць праходзіць т. т. **Найдус, Кізіла і Дукшт.** Просьба да ўсіх загатоўча-гандлюючых арганізацый, рабочых і служачых прыняць удзел у чыстцы.

ЗАЎТРА

Пасядж. прэзыд. Фрунз. РК МОПР'у—ў 19 г. Запраш. мопраўскі актыў.

Бюро ФК ЦСПСБ разам з АСФК і Аўтадорам паладжвае агульна-гарадзкую дэманстрацыю фізкультурнікаў і вялёсы-пэдыстых, прысьвечаную XIII зьезду КП(б)Б і фінішу ўсебеларускага зорнага вэлё-прабегу. Збор на Пл. Волі ў 17 з валоваю гада.

Клюб друкароў. Бюро фізкультуры ЦСПСБ сумесна з праўленьнем клюбу арганіз. агульна-гарадзкі вечар фізкультуры, прысьвечаны ўсебеларускаму зорнаму вэлё-прабегу. Пач. у 21 гадз. Білеты па прадпрыемствах.

Клюб камунальнікаў (Няміга, 8). Сход партыйцаў і камсамольцаў, якія жывуць у дамох ЖАКТу № 7. Пач. у 18 гадз.

Дом асьветы. ЦП саюзу працасьветы закупіла для членаў саюзу спэтакль з памяшканьні летняга тэатру «Прафінтэрн» **на 5 чэрвеня** «Чалавек з партфэлем» і оперу **на 3 чэрвеня** ў памяшканьні Дзяржтэатру «Аида». Білеты ў канц Дому з 12-14 і з 18-22 г.

КУРСЫ ПА ПАДРЫХТОЎЦЫ РАБОЧЫХ НА МЭДФАК

9-месячныя курсы для падрыхтоўкі рабочых на мэдфак пачынаюць працаваць 1 чэрвеня з 17 а паловаю г. у анатамічным корпусе (Універс. гарадок).

ПАСЬЛЯЗАЎТРА

МенАК КП(б)Б (заля пасядж., 3 пав., вул. Энгельса, 28). **Фрунзаўская раённая нарада** рабкораў, рэдактараў насьценгазэт і прадстаўнікоў цэнтральных газэт. Пач. у 18 гадз. Парадак дня: задачы друку ў перавыбарах фабзаўмясцкомаў, задачы насьценгазэт у асьвятленьні работы партзьвезьдаў.

Адказны рэдактар Ян. АСЬМОЎ.

Калектыў супрацоўнікаў канторы газ. «ЗЬВЯЗДА» выказвае сваё спачуваньне супрацоўніку канторы т. ДЗЯТЛЕНКУ з прычыны трагічнай сьмерці яго сына

АНАТОЛЯ.

ВЫШЛІ З ДРУКУ І ПАСТУПІЛІ Ў ПРОДАЖ

Я. ВАСІЛЕВІЧ. КП(б)Б у барацьбе за бальшавіцкую лінію (АД XII ДА XIII ЗЬЕЗДУ КП(б)Б). Стар. 16. Цана 3 кап.

БЕЛДЗЯРЖВЫДАВЕЦТВА.

БЕЛДЗЯРЖТЭАТР | ОПЭРА
Сёньня, 1-га чэрвеня „АИДА"

КІНО-ТЭАТР КІЛІЛЕЯ
Мастацкі фільм у 7 частках
СЭКТАНТЫ
Звыш праграмы кіно-часопіс Саўкіно № 25.
Пачатак сеанса а 7 г. Каса ад 5 гадз.

КІНО ПРАЦЯГВАЛЬ
Амэрыканскі мастацкі фільм
1.000 КОНСКІХ СІЛ
(Бура ў Каліфорніі)
Звыш праграмы КУЛЬТУРФІЛЬМ
Вытворчасьць электрычн. лямпачак
Пачатак 1-га сэансу а 7 г. увеч. Каса ад 5 г.

КІНО САД (Савецкая 71)
ПАТ і ПАТАШОН у новай камэдыі
ПАЧАТАК КАР'ЕРЫ кан. у 7 частках
Звыш праграмы хроніка САЎКІНО № 24
Пачатак 1-га сэансу а 9 гадз. Каса з 6 г.

КІНО ПРАЦЯГВАЛЬ
ТРУКАВЫ КІНО-РЭМАН
МІС МЭНД
2 серыі—11 частак у адным сеансе
У галоўнай ролі Ігар Ільінскі
Пачатак 1 сэансу а 7 гадз. — Каса з 5 гадз.

1-ны ТЭАТР КІНО-ТЭАТР „Юны Піянэр"
КУЛЬТУРФІЛЬМ
ТУРКСІБ у 5-ці частк.
Звыш праграмы хроніка „САЎКІНО"
Пачатак 1 сэансу а 2 гадз. дня. Каса з 12 г.

КІНО СПАРТАК
НЯМЕЦКІ БЛЯВІК
ЖЫЦЬЦЁ за ЖЫЦЬЦЁ
драма ў 10 частках.
Пачатак 1 с.—6 г., 2 с.—8 г. 30 м., 3 с.—11 г.
Каса—з 5 гадз.

Тэатр саду „Прафінтэрн"
Мастацкі перасоўны тэатр „КРАСНЫЙ ФАКЕЛ"
Нядзеля, 1 чэрвеня, для МЕНБУДУ
ЧУДАК
камэдыя ў 4-х дзеях.

Мастацкая-кіно-аповесьць
ВЕЦЕР у ТВАР

ДОМ АСЬВЕТЫ
5 чэрвеня, тэатрам „КРАСНЫЙ ФАКЕЛ"
у памяшканьні летняга тэатру саду „ПРАФІНТЭРН"
для членаў саюзу працасьветы будзе пакінуты п'еса
„ЧЕЛОВЕК С ПОРТФЕЛЕМ".
Білеты ў Доме Асьветы з 12—2 і з 5—10 гадз. увеч.

ПАТРАБУЕЦЦА для Менскага Белпэдтэхнікуму
1. І агранном з вышэйшай адукацыяй і пэдагагічным стажам для чытаньня лекцый і кіраўніцтва с.-г. практыкай.
2. І агранном з сярэдняй ці з вышэйшай адукацыяй для кіраўніцтва вузовай формай, чытаньня лекцый і кіраўніцтва с-г. практыкай.
3. І жывёлэ-пэдагог для чытаньня машынаазнаўства, кіраўніцтва тахнічнай практыкай і індустрыяльнай практыкай.
ПЛАТА ПА ЗГОД